

ДЗЯДЗЬКА ВАНЯ: «РОКУ НІКОЛІ НЕ ЗДРАДЖУ»

ЧЫРВОНКА

ДАДЗЁ, ДАЯНГ і... ТЭЛЕБАЧАННЕ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 МАЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 97 (29211)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, міністр аховы здароўя:**

*«Бальніцы Віцебска паэтапна вяртаюцца да звычайнага рэжыму работы. Калі на піку мы часам бачылі больш за 200 выпадкаў пнеўманіі ў суткі, то цяпер гэтыя паказчыкі ўпалі да 20-30 выпадкаў па Віцебску, што ўжо набліжаецца да натуральнай нормы. Віцебскі абласны анкадыспансер ужо займаецца аказаннем дапамогі профільным хворым. Другой медустановай горада, якая адновіць з наступнага тыдня сваю профільную работу, стане Віцебская абласная клінічная бальніца. Мы ўжо і ў Мінску асцярожна займаемся зваротным працэсам перапрафілявання ложкавага фонду, вяртаннем медустаноў да нармальнай дзейнасці. Колькасць клінік, якія будуць лячыць пнеўманіі, паступова паменшыцца, бо мы лічым, што складаны этап ужо пройдзены. Але паўтаруся: сітуацыя пад кантролем. У нас сфарміраваны дастатковы ложкавы фонд, і нават у самыя напружаныя дні выкарыстоўвалася толькі каля палова, а колькасць апаратаў ШВЛ, якія былі задзейнічаны для аказання дапамогі пацыентам з пнеўманіямі, ніколі не перавышала 15 % ад наяўнага парку».*

# У рытме маладосці



«Я гітару настрою»... Гэтую песню ведала ўся моладзь 70-х. Якраз у той час увайходзілі ў моду электрагітары і вакальна-інструментальныя ансамблі. Убачыць і паслухаць такія інструменты, асабліва ў вёсцы, — гэта было дзіва. Але мода зменлівая, і жывая ансамблевая музыка цяпер не ў пашане — электрагітары пыляцца на гарышчах, а то і на сметніках. Вось чаму жыхар вёскі Бабінавічы Лёзненскага раёна Андрэй БАЗЫЛЮК вырашыў захаваць памяць пра поп-моду мінулых часоў, размясціўшы на сцяне вясковага дома эксклюзіўныя музатрыбуты.

— Мне неверагодна шкада, што гэтыя гітары былі калісьці выкінутыя на сметнік. На жаль, цяперашняя моладзь не стварае ансамблі, так званыя ВІА, не захапляецца рытмамі, пад якія мы спявалі і танцавалі,— кажа гаспадар і дызайнер незвычайнай музейна-музычнай экспазіцыі пад адкрытым небам. І з доляй аптымізму зазначае: усё мінае, а музыка — вечная!

Андрэй Базылюк па-прафесіі далёкі ад музычнага мастацтва — дванаццаць шэсць гадоў працуе майстрам у Бібінавіцкім лясніцтве. У вольны час ён любіць упрыгожваць фасад дома прадметамі, якія выйшлі з ужытку, але сведчаць пра тое, што ў маладым узросце гаспадар усё-ткі цікавіўся музыкай і нават спяваў.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*На сайце «Звязды» глядзіце падборку фатаграфій, зробленых на сядзібе Андрэя Базылюка.*

Камунальныя стасункі

# АДХОДЫ — У ДАХОДЫ

## Анлайн-карта і новы палігон для сталіцы

**Амаль 22 мільёны кубаметраў смецця ўтварылася ў Беларусі летась. Раздзельна сабрана 765 тысяч тон адходаў, якія можна выкарыстоўваць паўторна. Толькі ў сталіцы за мінулы год утварылася 777,7 тысячы тон камунальных адходаў. Устаноўлены нарматыў стварэння на кожнага мінчаніна — 2,68 м³ за год — прыкладна 268 вёдзер. Штогод гэтая колькасць расце, таму задача раздзельнага збору смецця ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, становіцца ўсё больш актуальнай. Выдзеліць усім прыватным гаспадаркам кантэйнеры і ўкараніць у сістэму анлайн-картай руху аўтатэхнікі. Такія задачы ставяць перад сабой прадстаўнікі жыллёва-камунальнай сферы, каб палепшыць сітуацыю.**

### САРЦІРОЎКА, ПЕРАПРАЦОЎКА, ЗАХАВАННЕ

У Мінску са смеццем «змагаюцца» на чатырох сартавальных лініях агульнай магутнасцю 42 тысячы тон прадпрыемства «Экарэс». Тут жа дзейнічае лінія па перапрацоўцы палімерных адходаў і стварэнні з іх ПЭТ-гранул. Працуе смеццеперапрацоўчы сартавальны завод «Спецкамунаўтатранс» і лінія кампасціравання ў арганізацыі «Рэмондзіс». Вывозяць смецце з гарадскіх вуліц арганізацыі «Рэмондзіс», «Спецкамунаўтатранс», «Экалогія горада», і «Датком».


СТАР. 4


У рэжыме нон-стоп

**Урач-вірусолаг:**

# «РАБОТА ЦІКАВАЯ, АЛЕ НАДЗВЫЧАЙ НАПРУЖАНАЯ — ПРАЦУЕМ І ЎНАЧЫ, І Ў ВЫХАДНЫЯ»

**Як функцыянуе лабараторыя, якая выконвае тэсты на COVID-19**



Фота БелТА.

**З сярэдзіны красавіка лабараторыя Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя выконвае даследаванні на выяўленне COVID-19. Пробы сюды дастаўляюць з медустаноў усёй Мінскай вобласці. Відавочна, што сёння гэта самы запатрабаваны аналіз. Як цяпер працуе лабараторыя, колькі часу патрэбна на апрацоўку аднага тэста і чым адрозніваецца работа вірусолагаў падчас эпідэміі свінога грыпу і зараз?**


СТАР. 13


## КОРАТКА

- **Мінск да 2025 года поўнасцю перавядуць на водазабеспячэнне з падземных крыніц.**
- Беларусь паднялася ў сусветным рэйтынгу паштовых службаў на 21-е месца.
- **Аплата электронных білетаў на сайце БЧ стала даступная праз інтэрнэт-банкінг Беларусбанка.**


ISSN 1990 - 763X

20097>

9 771990 763008

Выбары-2020

# 15 ПАТЭНЦЫЙНЫХ КАНДЫДАТАЎ

## У Беларусі зарэгістравана пятнаццаць ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты

**Учора на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў зарэгістравана дзесяць ініцыятыўных груп, васьмі грамадзянам у рэгістрацыі адмоўлена ў сувязі з парушэннем патрабаванняў Выбарчага кодэксу Беларусі.**



Фота БелТА.

Напярэдадні зарэгістравана адна ініцыятыўная група, 22 грамадзянам у рэгістрацыі адмоўлена па аналагічных прычынах.

На першым пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, якое адбылося ў пятніцу 15 мая, зарэгістраваны чатыры ініцыятыўныя групы грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі. Тады было адмоўлена ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы дзесяці заяўнікам. Прычына тая ж — парушэнне патрабаванняў Выбарчага кодэксу Беларусі.

Усяго заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі падалі 55 асоб. Зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы Аляксандра Лукашэнкі, Алега Гайдукевіча, Юрыя Ганцэвіча, Уладзіміра Няпомняшчых, Наталлі Кісель, Віктара Бабарыкі, Валерыя Цапкалы, Сяргея Чэрэчня, Волькі Кавальковай, Ганны Канапацкай, Андрэя Дзмітрыева, Святланы Ціханоўскай, Аляксандра Таболіча, Юрыя Губарэвіча і Мікалая Казлова.

### ВЫБАРЫ АНЛАЙН

Усе самыя важныя падзеі сёлетняй выбарчай кампаніі асвятляюцца на адмысловым інфармацыйным рэсурсе «ВЫБАРЫ-2020». У прыватнасці, на ім паведамляецца, што імёны кандыдатаў у Прэзідэнты стануць вядомыя ў ліпені, паколькі члены ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў будуць збіраць подпісы з 21 мая па 19 чэрвеня ўключна, а падпісныя лісты правяраюцца 20 дзён.

Кандыдаты маюць права збіраць подпісы па месцы жыхарства грамадзян (рэкамендавана месц адпаведныя сродкі супрацьэпідэмічнай засцярогі), арганізоўваць пікеты паўсюль, акрамя забароненых месцаў. Агітацыя ў перыяд збору подпісаў не праводзіцца, але ініцыятыўныя групы маюць права «рэкламаваць» сваіх кандыдатаў і даваць выбаршчыкам інфармацыйныя матэрыялы. Аб гэтым паведаміла **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА** ў відэазвароце на сайце камісіі.

Выбары Прэзідэнта Беларусі адбудуцца 9 жніўня. Іх вынікі Цэнтрвыбаркам павінны падвесці не пазней за 19 жніўня. У выпадку неабходнасці другі тур пройдзе не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін, — 23 жніўня.

**Варвара МАРОЗАВА.**

❍ Тым часам

### ПАЧУЦЬ УСІХ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 23 мая, з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

наменнік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

наменнік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

наменнік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы наменнік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

наменнік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

наменнік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня Мінскага гарсавета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Блізкая ўлада

# ЗАХАДЫ, ПАЦВЕРДЖАНЫЯ ЧАСАМ

**Дакладныя падыходы ў эканоміцы дазволілі ў няпростай эпідэміялагічнай сітуацыі захаваць у краіне вытворчасці і рабочыя месцы.**

Такое меркаванне выказаў падчас правядзення прамой тэлефоннай лініі **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ.**

— Час даказаў правільнасць рашэнняў, прынятых у краіне, паколькі мы не спынілі вытворчасці, прадпрыемствы, захавалі максімальна рабочыя месцы, каб людзі маглі працаваць і зарабляць сродкі для сваёй жыццядзейнасці. Так, дзесьці ёсць і праблемы — мы не ідэалізуем сітуацыю, але глабальна, маштабна — абсалютна дакладныя падыходы. Сёння нават тыя краіны, якія да нас, магчыма, ставіліся з неразуменнем, прымаюць аналагічныя меры з улікам эпідэміялагічнага становішча, — цытуе Анатоля Маркевіча БелТА.

Эканамічная тэма была агучана ў звароце да памочніка Прэзідэнта з боку кіраўніка аднаго прыватнага прадпрыемства, якое распачало чатыры гады таму імпартазамяшчальную вытворчасць цеплаізаляцыйных матэрыялаў з базальтавага валакна. Ён паведаміў, што да гэтага часу прадпрыемства загружана на 55 % з прычыны таго, што канкурэнты — украінскія вытворцы — дэмпінгуюць цэнамі, і гэта дазваляе ім утрымлівацца на беларускім рынку. Прадпрымальнік звярнуў увагу на тое, што айчынным прадпрыемствам нядрэнна было б звяртацца да сваіх вытворцаў.

— Мы не можам абавязаць суб'ект гаспадарання працаваць з тым ці іншым пастаўшчыком прадукцыі. Нельга штучна ці ўручную рэгуляваць гэтыя пытанні — для гэтага існуе працэдура тэндара, — адзначыў Анатоль Маркевіч. Ён параіў прадпрымальнікам працаваць над павышэннем канкурэнтаздольнасці прадукцыі і зніжэннем вытворчых выдаткаў. З гэтым пагадзіўся і заяўнік, які падзякаваў за арганізацыю прамых ліній і магчымасць абмеркаваць пытанні, якія хвалююць, з уладамі.

Акрамя гэтай тэмы, падчас прамой лініі прагучалі і іншыя. Маладую маці-брастаўчанку непакоіць суседства з тэлекамунікацыйнай вышкай, былы загадчык фермы з Ляхавіцкага раёна скардзіўся на незаконнае звальненне з работы. Тэму працаўладкавання працягнуў інвалід з Кобрына, які прасіў дапамагчы яму з месцам работы. Некалькі званкоў са Століна і Кобрына датычыліся ўрэгулявання зямельных спрэчак. Прадстаўнік транспартнай кампаніі з Пінска цікавіўся, ці магчыма адкрыць пункт выдачы «дазволаў» на грузаперавозкі ў гэтым населеным пункце, каб не трэба было ездзіць у абласны цэнтр кожны тыдзень, як цяпер. Усяго да памочніка Прэзідэнта звярнуліся 17 чалавек, усе пытанні ўзятыя на кантроль.

# СТРУКТУРА ПЫТАННЯЎ НЯЗМЕННАЯ

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ правёў прамую тэлефонную лінію і дыстанцыйны прыём грамадзян у Першамайскім раёне Віцебска.**

Падчас прамой лініі ён выслухаў жыхароў не толькі заяўленага раёна, але і іншых раёнаў абласнога цэнтра і вобласці, якія агучылі жыллёвыя праблемы, пытанні сферы ЖКГ і абслугоўвання людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Напрыклад, жанчына, маці якой жыве ў Сянне, паскардзілася на мясцовых камунальнікаў, маўляў, не выконваюць сваіх жа абяцанняў. Сутнасць пытання ў наступным: з 2014 года ўчастак з домам моцна падтоплівае, капітальныя работы на вуліцы абяцалі зрабіць у 2016 годзе, але, як сцвярджае жанчына, іх не выканалі да гэтага часу, аднак ЖКГ у сваіх адказах запэўнівае, што ўсё неабходнае зроблена. Высвятляць усе абставіны і разбірацца з сітуацыяй будзе старшыня райвыканкама з выездам на месца.

Жыхарка абласнога цэнтра прасіла памочніка Прэзідэнта паспрыяць у тым, каб адправіць дачку, якая хварэе на бранхіяльную астму, на рэабілітацыю ў санаторый. Ён даручыў занятца гэтым пытаннем мясцоваму ўпраўленню ахове здароўя.

Яшчэ адна жанчына, якая жыве ў Віцебску і выхоўвае дачку-інваліда, паскардзілася, што цяпер ёй даводзіцца вазіць дзіця ў стаматалогію самастойна, а раней гэтыя паслугі аказвалі дома. З улікам таго, што дзяўчынка — інвалід, вазіць яе ў медыцынскія ўстановы дастаткова складана. Таксама жанчына звярнулася з асабістым пытаннем, якое датычыцца догляду за інвалідам. Памочнік Прэзідэнта запэўніў, што ў праблемах разбяруцца і дадуць адказы.

Нягледзячы на тое, што прамая лінія была запланавана для кантактаў з жыхарамі Першамайскага раёна Віцебска, Анатолю Ліневічу тэлефанавалі з розных частак рэгіёна, што дае больш шырокую карціну патрэб людзей.

— Мы адкрыты для ўсіх. Структура пытанняў заяўнікаў не змяняецца. Людзі звяртаюцца наконт ЖКГ, з зямельнымі спрэчкамі. Мы са свайго боку заўсёды гатовы пытанне ўрэгуляваць: ці вырашыць, ці падказаць, што рабіць, — цытуе словы памочніка Прэзідэнта БелТА.

Ён таксама адзначыў, што з улікам цяперашняй эпідсітуацыі неабходна выкарыстоўваць усе магчымасці для кантактаў з людзьмі і тэлефонныя лініі ў гэтым добра спрыяюць. Тым не менш плануецца, што ў найбліжэйшы час у рэгіёне распачнуцца традыцыйныя прыёмы, калі заяўнікі будуць не супраць асабістых кантактаў.

Што датычыцца дыстанцыйнага прыёму, да памочніка Прэзідэнта дазваніліся каля 20 чалавек, якія агучылі тэмы добраўпарадкавання населеных пунктаў, зямельныя спрэчкі, пенсійныя выплаты і жыллёвыя праблемы.

На слыху

# Выпускныя балі пад пытаннем

**Міністэрства адукацыі рэкамендуе ўручаць атэстаты выпускнікам школ ва ўрачыстай абстаноўцы. Учора на сайце ведамства з'явіўся ліст ад 19 мая «Аб арганізацыі ўручэння атэстатаў аб агульнай сярэдняй адукацыі» за подпісам намесніка міністра адукацыі Аляксандра Кадлубая. І гэта першы афіцыйны дакумент, які дае зразумець, якім чынам для выпускнікоў пройдзе іх развітанне са школай.**

У ім, у прыватнасці, паведамляецца, што з улікам эпідэміялагічнай сітуацыі і ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Міністэрства аховы здароўя, правядзенне масавых мерапрыемстваў у краіне абмежаванае. У гэтай сувязі Міністэрства адукацыі з усіх мерапрыемстваў па завяршэнні навучальнага года рэкамендуе арганізаваць толькі ўручэнне атэстатаў аб агульнай сярэдняй адукацыі ва ўрачыстай абстаноўцы і зрабіць гэта 10–11 чэрвеня.

Рашэнне пра фармат правядзення згаданага мерапрыемства ў кожнай канкрэтнай установе адукацыі прымаецца яе кіраўніком з удзелам бацькоўскага камітэта і па ўзгадненні з мясцовым выканаўчым і распарадчым органамі ўлады.

У дакуменце падкрэсліваецца, што з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі неабходна правесці растлумачальную работу аб фармаце правядзення мерапрыемства.

З мэтай мінімізацыі рызыкі ўзнікнення і распаўсюджвання вірусных і іншых інфекцый рэкамендуецца прыняць дадатковыя меры па забеспячэнні бяспекі і захавання здароўя навучэнцаў падчас правядзення мерапрыемства з улікам рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя. Якія канкрэтна меры трэба прыняць, у інструкцыйным лісце не ўдакладняецца.

Вядома, што ў сталіцы ўрачыстае ўручэнне атэстатаў пройдзе 10 чэрвеня ў другой палове дня. Калі дазволіць надвор'е, то мерапрыемства правядуць на адкрытым паветры. А вось традыцыйнага выпускнога для адзінаццацікласнікаў сёлета не будзе. «Адзінае, ад чаго мы адмаўляемся, гэта ад правядзення забаўляльных мерапрыемстваў пасля гэтага», — растлумачыў **першы намеснік старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Віталь ПРЫГОДЗІЧ.** — Пры гэтым урачыстасць моманту заканчэння школы захоўваецца».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Фінансы

## ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ ЗНОЎ РАСТУЦЬ

### На пачатак мая яны склалі 7,9 мільярда долараў

**Пасля значнага зніжэння ў сакавіку (на 11,6 %) у красавіку золатавалютныя рэзервы зноў пачалі расці і павялічыліся за месяц на 96,4 мільёна долараў (на 1,2 %). Такім чынам, міжнародныя рэзервовыя актывы дзяржавы на 1 мая, па папярэдніх звестках, склалі 7882,9 мільёна долараў у эквіваленце.**

Асноўным фактарам росту ўзроўню золатавалютных рэзерваў у красавіку стала купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа». Таксама павелічэнню рэзерваў спрыялі рост кошту манетарнага золата і паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад продажу Міністэрствам фінансаў на ўнутраным рынку аблігацый, намінаваных у замежнай валюце.

Як адзначылі ў прэс-службе фінансавага рэгулятара краіны, у красавіку ўрадам і Нацыянальным банкам выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 317 мільёнаў долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Экспертыза

# ФАКТАР ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

## Чаму Беларусі не пагражае дэфіцыт прадуктаў?


Фота БелТА.

**Сітуацыя, якая склалася сёлета, пацвердзіла ключавую каштоўнасць харчовай бяспекі. Такую думку выказаў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ падчас чарговага пасяджэння сумеснага праекта Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (БІСД) і БелТА «Экспертнае асяроддзе».**

### РЭЙТЫНГ ДЗЯРЖАВЫ

Эксперты звярнулі ўвагу на заяву выканаўчага дырэктара Сусветнай харчовай праграмы (СХП) ААН Дэвіда Бізлі. Выступаючы ў красавіку на віртуальным пасяджэнні Савета Бяспекі арганізацыі, ён перасцярог, што чалавецтва можа сутыкнуцца з голадам біблейскага маштабу з-за пандэміі каранавіруса, калі своечасова не будуць прыняты меры для харчовай бяспекі. «Цяперашняя сітуацыя змяніла фокус і разуменне, што такое харчовая бяспека. Яна паказала, што гэтая каштоўнасць — адна з ключавых. Фактычна гэта рэйтынг канкурэнтаздольнасці дзяржавы сёння. Беларусь у гэтым плане выглядае вельмі годна», — падкрэсліў Уладзімір Улаховіч.

«Паводле рэйтынга амерыканскага часопіса The Economist, па індэксе сусветнай харчовай бяспекі Беларусь мае найвышэйшыя пазіцыі. Варта падкрэсліць, што адно з першых месцаў наша краіна займае па такім крытэрыі, як даступнасць харчавання насельніцтву», — азначыў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі Гардзей ГУСАКОЎ.**

### СТАНОЎЧЫ ТРЭНД

Як лічыць Уладзімір Улаховіч, прагнозныя паказчыкі па экспарце сёлета Беларусь выканае. «Таму што ёсць вялікая патрэба ў прадуктах харчавання. Але пры гэтым трэба разумець, што ў цэлым рэцэсія, эканамічны спад будуць уплываць і на гандлёвыя адносіны з пункту гледжання прыцягнення фінансавых сродкаў, новых тэхналогій, інвестпраектаў», — адзначыў старшыня БелГПП. Над гэтай праблемай трэба будзе папрацаваць з пазіцыі дзяржрэгулявання, доўгатэрміновага планавання, захавання натуральных рэсурсаў. «Гэта таксама мае дачыненне да экспарту. Таму што экспарт сёння — гэта не толькі выраблёная прадукцыя, гэта глыбіня вытворчага працэсу, незалежнасць кармавой базы, генетычных матэрыялаў», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч.

Паводле інфармацыі **начальніка галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксея БАГДАНАВА,** за першы квартал гэтага года Беларусь экспартавала харчавання на 1,4 мільярда долараў, што на 9,8 працэнта больш, чым у студзені — сакавіку мінулага года. «У год у краіне вырабляецца прыкладна 7,4 мільёна тон малака, з якіх 60 працэнтаў мы экспартуем. Мяса — 1,2 мільёна тон, з якіх 30 працэнтаў — наш экспартны патэнцыял. Экспарт прадукцыі раслінаводства складае каля 500 мільёнаў долараў і штогод расце. Малочная група — 2,2 мільярда долараў. Летась мы практычна падышлі да мільярда долараў экспарту па мясе. Сёлета адзначаем станоўчы трэнд з экспартам прадуктаў харчавання», — расказаў ён.

Пры гэтым Беларусь больш чым на 80 працэнтаў забяспечвае сябе харчаваннем. Астатнія пазіцыі — тавары так званага крытычнага імпарту: цытрусавыя, кава, чай і г. д. «Але што датычыцца асноўных відаў прадукцыі — мясная, малочная, хлебабулачная група, то тут мы цалкам сябе забяспечваем. У гандлёвых сетках гэтыя тавары практычна на 99,9 % менавіта айчыннай вытворчасці», — заўважыў Аляксей Багданаў.

### ПАСЛЯ КАРАНЦІНУ

Сітуацыя з харчаваннем у свеце ў цэлым добрая, праблема — у наступствах каранціну з-за COVID-19. Такую думку выказаў **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Антон ДУДАРОНАК.** У якасці прыкладу ён прывёў сусветны рынак кавы. «Калумбія, Бразілія — дзве з чатырох вядучых краін, якія пастаўляюць каву на сусветны рынак. З-за каранавіруса, абмежаванняў там не хапае рабочых рук. Людзі не могуць туды дабрацца. Адпаведна няма каму збіраць ураджай кавы. Гэта прывядзе да таго, што будзе дэфіцыт на рынку, цэны вырастуць, ён дэстабілізуецца. Цяжкасці звязаны не толькі з тым, як сабраць ураджай, але і каму і як яго прадаць, як даставіць», — дадаў аналітык БІСД.

Як адзначалася падчас пасяджэння «Экспертнага асяроддзя», яшчэ да пандэміі, калі эканоміка працавала ў штатным рэжыме, у свеце налічвалася больш за 820 мільёнаў чалавек, якія галадалі. Сёлета гэтая лічба павялічваецца, упэўнена набліжаецца да мільярда. «Паводле даклада ААН аб уплыве каранавіруса на эканоміку краін, якія развіваюцца, Лацінская Амерыка, Афрыка, Азія і Блізкі Усход сутыкнуцца з праблемай эканамічнай рэцэсіі, калі ім не будзе чым аддаваць даўгі. Адсюль паўстануць праблемы голаду», — канстатаваў аналітык БІСД.

Начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей Багданаў прызнаўся, што ў яго некалькі альтэрнатыўны погляд на гэты конт. «У мяне вельмі вялікі скептыцызм наконт гэтага ўсяго. Мы жывём не ў біблейскія часы, пры зусім іншым тэхнічным укладзе. Вытворчасць вырасла ў дзясяткі, сотні разоў у кожнай краіне свету. Такой разрухі ў лагістыцы абсалютна няма, гэта таксама няпраўда. Мы як пастаўлялі прадукцыю, так і пастаўляем. Хоць, безумоўна, ёсць цяжкасці. Таму шчыра скажу па пытанні біблейскага голаду, я вельмі моцна сумняваюся, што гэта будзе», — заўважыў Аляксей Багданаў.

### КРЫЗІС ЯК ШАНЦ

У Мінсельгасхарчы ўжо цяпер адзначаюць вялікае зніжэнне спажывецкага попыту насельніцтва краін СНД. «Стратэгічна мы выбудоўваем нашу палітыку знешнеэканамічнай дзейнасці і рэалізацыі прадуктаў харчавання, не грунтуючыся толькі на якімсьці адным рынку. Мы першапачаткова ў прыярытэт паставілі дыверсіфікацыю, каб не зацыкліваецца на адным рынку, а размяркоўваць нашы тавары экспартнага інтарэсу па ўсім свеце», — адзначыў Аляксей Багданаў. Летась Беларусь экспартавала прадукты харчавання ў 104 краіны свету. «Міністэрства актыўна вядзе работу па адкрыцці новых рынкаў збыту з пункту гледжання ветэрынарна-санітарнага допуску. У прыватнасці, у пачатку квартала адкрылі 15 прадпрыемстваў на Кітай, сертыфікавалі малочную прадукцыю для паставак у В'етнам. Цяпер такую работу завяршаем па мясе. Міністэрства прадпрымае шмат намаганняў, каб сапраўды выкарыстоўваць гэты крызіс як шанц па павелічэння аб'ёмаў паставак, пашырэння асартыменту», — падкрэсліў начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці. Прычым беларускі бок зацікаўлены ў тым, каб павялічваць пастаўкі гатовай прадукцыі, а не сыравіны. Па словах Аляксея Багданава, гаворка ідзе пра тое, каб «на паліцы ў крамах паставіць прадукцыю, каб пазнаваўся беларускі брэнд, а не прыходзіла сыравіна, якую потым перапрацоўваюць мясцовыя вытворцы».

Прасоўванне беларускай прадукцыі на рынках ідзе нядрэнна. Уладзімір Улаховіч пракаментаваў сітуацыю з лагістыкай паставак прадуктаў харчавання ва ўмовах пандэміі. «У нас, напрыклад, ёсць такі індыкатар: мы выдаём пасведчанне аб абставінах непераадольнай сілы. Пачынаючы з канца лютага ў нас каля 70 такіх запытаў, але ўсе яны датычацца сферы паслуг альбо паставак абсталявання. Няма ніводнага запыту па зрывах кантрактаў па пастаўках прадуктаў харчавання, — адзначыў ён. — Наша сіла ў тым, што Беларусь апошняе дзесяцігоддзе паслядоўна і грунтоўна працавала ў аграрным сектары. Таму мы вельмі самавіта выглядаем на глабальным узроўні як экспарцёр і досыць спакойна сябе адчуваем».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Бразілія становіцца новым эпіцэнтрам пандэміі COVID-19



На яе прыпадае палова ўсіх хворых і памерлых у Лацінскай Амерыцы. Бразілія стала трэцяй краінай у свеце пасля ЗША і Расіі па колькасці тых, хто заразіўся каранавірусам. Па інфармацыі Універсітэта Джонса Хопкінса, які праводзіць падлікі на аснове звестак федэральных і мясцовых улад, у гэтай краіне да 20 мая было зафіксавана амаль 272 тысячы выпадкаў заражэння каранавірусам, пайшлі з жыцця 17 983 чалавекі. Учора ўпершыню колькасць памерлых ад COVID-19 у краіне перавысіла тысячу чалавекі. Але, паводле ацэнак экспертаў, рэальная колькасць інфіцыраваных і памерлых у Бразіліі можа пераўзыходзіць афіцыйныя даныя прыкладна ў 15 разоў, бо маштабы тэсціравання ў гэтай самай густанаселенай краіне Лацінскай Амерыкі невялікія. Як заявіла кіраўнік бразільскага падраздзялення арганізацыі «Урачы без межаў» Ана дэ Лемас, Лацінская Амерыка стане наступным глабальным ачагом пандэміі. Колькасць тых, хто захварэў каранавірусам там вырасла за месяц у восем разоў, а колькасць памерлых — у дзевяць разоў. Лацінскай Амерыцы варта рыхтавацца да «вірусная апакаліпсісу», адзначае нямецкае выданне Der Spiegel.

### Германія аказалася найбольш устойлівай да крызісу ў Еўропе

На фоне пандэміі эканоміка Германіі перажыла рэкордны абвал з часоў фінансавага крызісу 2008 года. Сёлета ў першым квартале ВУП скараціўся на 2,2 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам летась. Тым не менш, як адзначаюць эксперты, страты іншых еўрапейскіх краін аказаліся значна вышэйшыя. Так, у першым квартале эканоміка Францыі скарацілася на 5,8 працэнта (рэкорд з часоў заканчэння Другой сусветнай вайны), Італіі — на 4,7 працэнта, Іспаніі — на 5,2 працэнта, Бельгіі — на 3,9 працэнта. Пра гэта паведамляе Tagesspiegel. Больш за тое, у параўнанні з іншымі буйнымі еўрапейскімі эканомікамі Германіі ўдалося сфарміраваць вялікую фінансавую падушку бяспекі. Таксама ўлады падрыхтавалі самы комплексны пакет мер сацыяльнай дапамогі, які складае 30 працэнтаў ВУП. Для параўнання ў Іспаніі — толькі 12 працэнтаў.

### Facebook прадставіў уласную платформу для інтэрнэт-гандлю



Новы сэрвіс Facebook Shops — прамы канкурэнт Amazon і eBay, падкрэслівае Financial Times. Платформа дазваляе прадаўцам ствараць лічбавыя вітрыны і працаваць адначасова з Facebook і Instagram. У будучыні кампанія абяцае таксама ўкараніць магчымасць рабіць пакупкі праз чаты на WhatsApp і месенджары сваіх сацыяльных сетак. Новы сэрвіс Facebook кідае выклік Amazon таму, што ў сацыяльнай сетцы 2,6 млрд карыстальнікаў, якія могуць стаць пакупнікамі, падкрэслівае Financial Times. У будучыні Facebook Shops таксама можа стаць канкурэнтам для сэрвісаў дастаўкі ежы — генеральны дырэктар кампаніі Марк Цукерберг адзначыў, што «было б добра» размяшчаць на платформе прапановы рэстаранаў і службаў заказу. Ён дадаў, што яго кампанія таксама зоймецца ўкараненнем паслуг у сферы дастаўкі і лагістыкі. Цукерберг таксама расказаў FT, што паскорыў працэс запуску Shops, каб скарыстацца бумам на рынку анлайншопінгу, які адбыўся з-за пандэміі каранавіруса.

Падрабязнасці

# СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ЗНІЖАНА ДА ВАСЬМІ ПРАЦЭНТАЎ

**Стаўка рэфінансавання з 20 мая зніжана з 8,75 працэнта да 8 працэнтаў гадавых, стаўка па крэдыце авернайт — з 9,75 працэнта да 9 працэнтаў гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — з 7,75 працэнта да 7 працэнтаў гадавых, паведамілі БелТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.**

Як растлумачыў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел Калаур, рашэнне грунтуецца на абноўленым прагнозе развіцця эканомікі і грашовакрэдытнай сферы да канца 2020-га і на 2021 год. У ім улічана істотнае змяненне сітуацыі ў свеце і Беларусі, якое адбылося за апошні час.

Паводле гэтых ацэнак, бягучае паскарэнне інфляцыі з'яўляецца часовым, ужо ў найбліжэйшыя месяцы ўзмоцніцца дэзынфляцыйны ўплыў з боку сукупнага попыту, у выніку чаго рост цэн запаволіцца да ўзроўню, які назіраўся ў канцы мінулага года. Па выніках 2020-га інфляцыя прагназуецца ў дыяпазоне 5–6 працэнтаў.

«У існуючых эканамічных умовах зніжэнне стаўкі рэфінансавання да васьмі працэнтаў гадавых дасць магчымасць захаваць прымальны ўзровень цэнавай стабільнасці, а таксама будзе садзейнічаць падтрыманню фінансавай стабільнасці. У сваю чаргу, змяншэнне крэдытнай нагрузкі і павышэнне даступнасці пазыковых сродкаў для нацыянальнага бізнесу і дамашніх гаспадарак будуць садзейнічаць падтрыманню спажывецкай і інвестыцыйнай актыўнасці. Гэта дасць магчымасць беларускім вытворцам тавараў і паслуг хутчэй аднавіцца пасля зняцця ў свеце каранцінных мер», — адзначыў Павел Калаур.

# АДХОДЫ — У ДАХОДЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

*— За першы квартал сёлета сабрана 56,8 тысячы тон другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), —* расказаў **Уладзімір ЛЕБЕДЗЬ, начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама.** *— Для Мінска, як любога мегаполіса, гэта вельмі актуальная праблема. Цяпер мы спажываем тавараў і ствараем смецця ў разы больш, чым 10—15 гадоў таму. І ў асноўным гэта адходы, якія нельга захоўваць, бо яны вельмі доўга раскладаюцца ці ўвогуле не робяць гэтага. Так што перапрацоўка, сарціроўка і збор ДМР застаецца для сталіцы важнай задачай.*

Максімальна выдзяляць ДМР каля крыніц іх стварэння, а таксама ўкараняць найноўшыя тэхналогіі па сартаванні адходаў раіць і **Алена АЎРАМЕНКА, начальнік аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Прадстаўнікі камітэта кантралююць, як суб'екты гаспадарання выконваюць заканадаўства ў галіне абыходжання з адходамі. А таксама сочаць, каб у смецці, якое прывозяць на аб'екты захавання адходаў, не было другаснай сыравіны.

*— Па выніках праверак выяўлены шэраг парушэнняў па эксплуатацыі аб'ектаў захавання адходаў, якія вычарпалі свой рэсурс і ўжо маглі негатыўна паўплываць на кампаненты прыроднага асяроддзя, —* падзялілася Алена Аўраменка. *— Мы накіравалі лісты мясцовым выканаўчым органам аб закрыцці такіх аб'ектаў. У 2017 годзе закрылі палігон «Паўночны», у 2019-м — палігон «Прудзішчы». Магчымасцяў палігона «Трасцянецкі», па разліках, хопіць яшчэ на год.*

Побач з «Трасцянецкім» ужо выдзелена месца пад будаўніцтва трэцяй чаргі палігона — 15 гектараў. Аднак захаванне — не найлепшы спосаб, бо ў працэсе раскладання адходаў забруджваюцца падземныя воды, землі, якія прылягаюць да палігонаў, таму першачарговая задача — максімальна сарціраваць смецце, падкрэсліла прадстаўнік камітэта.



## ЕЎРАКАНТЭЙНЕРЫ І МОДУЛЬНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ

Асобна збіраць смецце можна, выкідваючы яго ў спецыяльныя кантэйнеры для пластыку, шкла і паперы. У сталіцы функцыянуе 1834 кантэйнерныя пляцоўкі і 26 269 кантэйнераў для збору адходаў, з якіх 9578 — для ДМР.

*— Вядзецца работа па перадачы кантэйнераў прыватнаму сектару. Усяго маецца 20 446 кантэйнераў, 9927 з якіх — для збору цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) (насельніцтву перададзена 71 % такіх ёмістасцяў) і 10 519 — для збору ДМР (75,5 % ужо перададзены домаўладальнікам), —* агучыў лічбы **Сяргей РУБАНАЎ, выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі (МГЖГ).**

У перспектыве развіцця сістэмы збору ЦКА і выдзялення з іх ДМР прадугледжана ў прыватнасці ўстаноўка пластыкавых еўракантэйнераў для адходаў і змешанай другаснай сыравіны аб'ёмам 120 літраў. Прыватны сектар маркуецца забяспечыць такімі кантэйнерамі на 100 %.

*— Плануецца раздзельны збор арганічнай фракцыі ў прыватным сектары, для чаго прадугледжана каля 14 тысяч кантэйнераў, —* дадаў Сяргей Рубанаў. *— Патрабуе рашэння і праблема рэканструкцыі існуючых кантэйнерных пляцовак.*

Паколькі ў існуючай забудове складана размясціць кантэйнерныя пляцоўкі, спецыялісты распрацавалі тыпавую модульную канструкцыю для збору адходаў. Яна ўжо функцыянуе на вуліцы Ташкенцкай. Сёлета плануецца арганізаваць яшчэ шэраг такіх мабільных пляцовак. Яны больш танныя, чым звычайныя, а ў выпадку аварыі сетак побач з такім прыстасаваннем, яго можна спецтэхнікай за 15 хвілін перанесці ў іншае месца.

У сталіцы функцыянуе яшчэ каля 2000 смеццеправодаў, хоць працягваецца работа па іх заварванні. У Заводскім раёне ў рамках пілотнага праекта ў самім смеццеправодзе ўсталяваны дзверы з клапанам, які гайдаецца. Гэта дазваляе абмежаваць наведванне жыхароў у непасрэдна смеццепрыёмную камеру і пакідае магчымасць выкінуць смецце праз існуючае «акно».

*— У месцах, дзе мы плануем пакінуць смеццепрыёмныя камеры, будуць устаноўлены кантэйнеры для раздзельнага збору адходаў, —* падкрэсліў Сяргей Рубанаў.

*— Калі больш за палову жыхароў будуць супраць закрыцця смеццеправода, яго не завараць, аднак работа па растлумачэнні неабходнасці гэтага будзе працягнута, —* удакладніў Уладзімір Лебедзь.

## САБРАЦЬ ПЛАСТЫК

У сталіцы збіраецца 26 % другаснай сыравіны ад агульнага аб'ёму ДМР па ўсёй краіне. Летась у Мінску выбралі каля 200 тысяч тон другасных рэсурсаў, што на 5,5 % больш, чым у 2018-м. Горад заняў першае месца ў краіне па росце аб'ёмаў збору самых праблемных адходаў — пластыку (сабрана на 37,5 % больш, чым у 2018-м), падзялілася **Ніна КУЛЬБЕДА-КАМШЫЛАВА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».**

Аднак па наяўнасці інфраструктуры для раздзельнага збору мінчане адстаюць ад іншых рэгіёнаў. У сярэднім на 1000 сталічных жыхароў прыходзіцца 5,2 кантэйнера, а ў іншых гарадах — 8,5. Тая ж карціна і па прыёмна-нарыхтоўчых пунктах. У рэгіёнах на адзін прыёмны пункт другаснай сыравіны прыходзіцца пяць-шэсць тысяч грамадзян. А ў сталіцы працуе 217 прыёмачных пунктаў — адна ўстанова на 9,2 тысячы мінчан.

Інфармацыю пра знаходжанне нарыхтоўчых пунктаў, дарэчы, можна знайсці на адміністрацыйных сайтах раёнаў. Адзіная ў сталіцы схема па абыходжанні з адходамі вызначае работу для ўсіх арганізацый і прадпрыемстваў Мінска. Яна прадугледжвае інтэрактыўную карту, якая ў рэжыме анлайн дазволіць пабачыць, дзе і якія размешчаны кантэйнеры. Таксама мяркуецца ўкараніць у сістэму анлайн-картай руху аўтатэхнікі, дзе будзе падказвацца, куды чалавеку хутчэй пад'ехаць і якую схему руху транспарту выбраць, дадаў Уладзімір Лебедзь.

**Ірына СІДАРОК.**

Без межаў

## Тур па няходжаных сцежках

**Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік павінен стаць новым запатрабаваным ў турыстычнай галіне кірункам.**

Дзякуючы ўнікальным прыродным рэсурсам, багатай біяразнастайнасці, асаблівым умовам, якія склаліся на гэтых тэрыторыях (мясціны ўжо 34 гады пазбаўлены ўплыву чалавека), сюды можна заваблівацць даследчыкаў і аматараў некранутай прыроды. Варты ўвагі і Дняпроўска-Сожскі заказнік, пра які, нягледзячы на тое, што ён працуе ўжо больш за 20 гадоў, сёння мала хто ведае.

Пачаць «раскрутку» гэтых тэрыторый плануецца ў рамках трансгранічнага праекта па развіцці адукацыйнага турызму ў прыродных запаведных зонах. На працягу гэтага года будуць распрацоўвацца маршруты па запаведных тэрыторыях у Гомельскай вобласці і памежных рэгіёнах Польшчы. Спецыялісты запаведнікаў, прадстаўнікі культуры і турызму абедзвюх краін будуць абменьвацца ведамі і вопытам. На гэты год былі запланаваны фотамастацкія пленэры ў запаведных зонах, пілотныя заняткі і туры, стварэнне ролікаў пра запаведнікі Беларусі і Польшчы.

Праект рэалізуецца грамадскай арганізацыяй «Беларускі зялёны крыж» у партнёрстве з Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведнікам, Дняпроўска-Сожскім заказнікам і Асацыяцыяй спадчыны Падляшша ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Польшча—Беларусь—Украіна 2014—2020, якая фінансуецца Еўрапейскім саюзам.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Трэба ведаць

# Як карыстацца маскай, каб не нанесці шкоду экалогіі

**Навіна аб тым, як спрыяльна пандэмія каранавіруса адбілася на стане навакольнага асяроддзя, мабыць, абляцела ўжо ўсе СМІ — у каналы Венецыі нават сталі вяртацца дэльфіны і лебедзі. Аднак зараз эколагаў пачала хваляваць іншая праблема — медыцынскія маскі, выкарыстанне якіх стала больш масавым апошнім часам. У Цэнтры экалагічных рашэнняў расказалі, як правільна выкідаць новую дадатковую крыніцу адходаў.**



greenbelarus.info

Спецыялісты цэнтра лічаць, што перш за ўсё, трэба аб'ектыўна ацэньваць неабходнасць карыстання маскай у тым ці іншым выпадку. Напрыклад, на сайце Міністэрства аховы здароўя адзначаецца, што павязку трэба абавязкова насіць, калі ёсць сімптомы захворвання ці вы кантактуеце з тым, хто хварэе.

*— Гэта значыць, што не трэба насіць маску там, дзе яна зусім непатрэбна, напрыклад, на вуліцы ці ў аўтамабілі, калі вы едзеце адзін, —* тлумачыць **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў, кіраўнік праграмы па хімічных рэчывах і адходах Яўген ЛАБАНАЎ.** — Гэта не толькі не мае ніякага сэнсу, але і дрэнна адбіваецца на становішчы навакольнага асяроддзя, бо з'яўляецца больш адходаў.

Аднаразовыя медыцынскія маскі нельга выкарыстоўваць некалькі разоў, нават калі правядзеш іх дэзынфекцыю. Пры гэтым іх патрэбна мяняць кожныя дзве гадзіны. Спецыялісты адзначае, што такія маскі вырабляюць з нятканага палімернага матэрыялу, і таму іх нельга перапрацаваць.

Па магчымасці перад тым, як выкінуць маску, правядзіце яе дэзынфекцыю, а пасля гэтага вымыйце рукі ці апрацуйце іх антысептыкам.

*— Вельмі важна правільна ад іх пазбаўляцца — маску трэба акуратна здымаць за завязкі і класці ў пакет, і толькі потым выкідаць у закрытую урну ці кантэйнер для агульнага збору адходаў. І ў ніякім выпадку не трэба выкідаць маску ў кантэйнеры для другаснай сыравіны, у тым ліку, і ў тыя, што прызначаны для збору пластыку, —* адзначае суразмоўнік. *— Больш за тое, маскі пажадана не выкідаць у вулічныя урны, бо іх можа знесці ветрам. Нельга іх выкідаць і ў каналізацыю, бо яны, як і вільготныя сурвэткі, могуць засмеціць і стаць прычынай няспраўнасці сістэм водаачысткі.*

**Па магчымасці перад тым, як выкінуць маску, правядзіце яе дэзынфекцыю, а пасля гэтага вымыйце рукі ці апрацуйце іх антысептыкам.**

Кіраўнік цэнтра звяртае ўвагу, што гэта датычыцца аднаразовых масак, якія мы штодзённа выкарыстоўваем. Маскі ж з бальніц і паліклінік павінны ўтылізавацца, як медыцынскія адходы.

*— Калі ж вы носіце маску з прынцыпу засцярогі, то лепш выкарыстоўваць шматразовую. Яе можна набыць у аптэках, крамах ці самастойна зрабіць з марлі, баваўны ці іншай тканіны, —* раіць спецыяліст. *— Іх таксама трэба мяняць кожныя дзве гадзіны, здымаць за завязкі і класці ў пакет, калі прыйшлося гэта зрабіць па-за домам.*

Каб прадэзынфіцыраваць такую маску, неабходна памыць яе ў гарачай вадзе з мылам (можна пракіпяціць) і адпарыць прасам. Эколагі лічаць, што лепш выкарыстоўваць шматразовыя маскі, таму што яны служаць да зносу. Калі вы вырашылі зрабіць маску самастойна, то лепш пашыць яе з тканіны, якая ў вас ужо ёсць, а не набываць для гэтага новы матэрыял.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 МАЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15886)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Дзядзька Ваня:

# «Року ніколі не здраджу»



**Любоў да рока, брутальны імідж і імкненне да лепшага — вось асноўныя складнікі яго жыцця. Іван ВАБІШЧЭВІЧ, вядомы ўсім пад псеўданімам Дзядзька Ваня, расказаў нам, як сумяшчае працу выкладчыка і шоўмена, пра здымкі ў кіно і сямейныя падарожжы.**

***— Як вы адважыліся так кардынальна памяняць сваё жыццё, калі пасля навучання ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце сталі музыкантам?***

— З музыкай быў звязаны з самага дзяцінства, але, шчыра кажучы, ніколі не думаў пра тое, што яна стане маёй прафесіяй. Усё пачалося з таго, што я вучыўся ў школе з музычным ухілам, затым спяваў у хоры, а пазней мяне занесла ў дзіцячую студыю пры оперным тэатры. Ну і, вядома, на развіццё музычных і творчых здольнасцяў вельмі паўплываў удзел у КВЗ, які пачаўся ў старэйшых класах. Пасля школы паступіў у Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт — гэта, можна сказаць, ужо сямейная традыцыя. Але музыку не закідваў, сам навучыўся іграць на гітары. І аднойчы ва ўніверсітэце на пары па філасофіі я напісаў сваю першую песню. Відаць, пара была вельмі цікавая *(смяецца)*. Пасля гэтага выпадку мае музычныя амбіцыі неяк пацішэлі на пару гадоў, а потым усё вярнулася з падвоенай сілай. Я зноў пачаў пісаць песні. Вядома ж, кожная новая была падмацавана рознымі перажываннямі, эмоцыямі і жыццёвымі сітуацыямі. Адну з іх я запісаў на студыі, і па збегу абставін і новых знаёмстваў яе пусцілі на радыё. Менавіта з гэтага моманту пачалася мая прафесійная дзейнасць у музычнай сферы.

***— Гэта значыць, вы пачыналі як сольны выканаўца?***

— Не, менавіта ў той момант, калі да мяне вярнулася натхненне, я пазнаёміўся са сваім басістам, маім жа суаўтарам, а потым паціху набраўся і астатні састаў. І песню мы ўжо запісвалі гуртом, пазней вырашылі зрабіць прэзентацыю кліпа, а потым пачалі выступаць ужывую. А часам своеасаблівага прызнання нас публікай я лічу выступленне на «Новай хвалі». Вядома, на працягу ўсяго творчага шляху састаў гурта змяняўся. Але нас усіх заўсёды аб'ядноўвала любоў да агульнай справы.

***— А адкуль з'явіўся такі псеўданім — Дзядзька Ваня?***

— Гэта здарылася на «Новай хвалі». Яе рэжысёр Аляксандр Давыдавіч Рэўзін прапанаваў мне такую ідэю, бо тады яшчэ маё прозвішча было невядомае. А з часам эвалюцыю назвы прайшла і мая група. Спачатку яна называлася «Van Helsing», затым «Дзядзька Ваня і гурт Van Helsing», потым «Дзядзька Ваня і пляменнікі», а праз некаторы час хлопцы мне сказалі: «Так, давай без гэтых усіх прыставак, хай будзе проста гурт «Дзядзька Ваня» і ўсё, на гэтым мы і сышліся.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

У ліку найлепшых

# ІДЭІ, ШТО СТАНОВЯЦЦА «ПЕРШЫМІ»

**Напэўна вы ўжо ведаеце пра сацыяльна-адукацыйны праект «Першыя», які рэалізуецца кампаніяй А1 пры падтрымцы арганізатараў канферэнцыі TEDxMinsk і скіраваны на школьнікаў старэйшых класаў. Дзесяць яго фіналістаў атрымалі персанальных ментараў TEDx, з дапамогай якіх прэзентуюць свае ідэі падчас маштабнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouthMinsk, якая адбудзецца ў верасні. Давайце пазнаёмімся з некаторымі героямі і іх ініцыятывамі.**



Дзяніс Рабчук.

**У дзесяцікласніка брэсцкай гімназіі № 1 Дзяніса РАБЧУКА** шмат разнабаковых хобі. Хлопец — пераможца міжнародных алімпіяд па геаграфіі: заваяваў серабро на Baltic iGeo і бронзу на International Earth Science Olympiad, да таго ж, ён сур'ёзны сапернік у інтэлектуальных гульнях — яго каманда «Галандскі нацюрморт» у «Што? Дзе? Калі?» лічыцца адной з самых моцных у краіне. А яшчэ герой вельмі захапляецца беларускай паэзіяй. Таму ініцыятыва ў рамках праекта «Першыя» адпаведная. Школьнік стварае паэтычныя муралы на вуліцах свайго горада.

— Ідэя з'явілася ўлетку, калі ўпершыню пабываў у Львове і ўбачыў там муралы з вершамі ўкраінскіх паэтаў на сценах. Падумаў, чаму б не зрабіць нешта падобнае ў Брэсце? Пасля прыезду даведаўся, што арганізацыя «Агенцтва рэгіянальнага развіцця Дзедзіч» праводзіць конкурс міні-грантаў, і мы з камандай аднадумцаў вырашылі ўдзельнічаць. У выніку атрымалі фінансаванне і прыступілі да рэалізацыі праекта #vershybrest. У цэнтры Брэста ўжо з'явіліся тры муралы: з творам Максіма Багдановіча «Санет», Ніны Мацяш «Без цябе» і Генадзя Бураўкіна «Атруці мяне вясновым хмелем».

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Бачыць мэту

# ДАДЗЁ, ДАЯНГ І... ТЭЛЕБАЧАННЕ

## Як сумясціць адзінаборствы і журналістыку

**Збегла з апошняй пары, трапіла на трэніроўку і... зразумела, кім хоча быць. Цяпер з'яўляецца кандыдатам у майстры спорту (КМС) па тэквандо, валодае тэхнікай каратэ і захапляецца тайскім боксам. 22-гадовая Вікторыя ШАХНО — пра свой "вецер перамен" і спалучэнне журналісцкіх якасцяў з трэнерствам.**



### ПЕРАМОЖНІЦА СА ЗЛАМАНАЙ РУКОЙ

Адзінаборствы вабілі дзяўчыну даўно. З каратэ яна пазнаёмілася яшчэ ў школе, аднак больш сур'ёзна пачала займацца ўжо студэнткай БДУ. Як толькі Вікторыя даведалася пра секцыю ў ВНУ, адразу паехала знаёміцца і запісвацца. Трапіўшы на першую трэніроўку, адзначала для сябе: тут працуюць жорстка. Дзяўчыне спадабалася яшчэ больш, і далей у спартыўную залу Вікторыя неслася з пар, як дамоў.

— Носячы белы пояс, разумела важнасць «лесвіцы». Здаеш экзамен, падчас якога правяраюцца фізічная форма і характар. Такім чынам ты расцеш. Але ж акурат падчас здачы на яго я была дзе заўгодна, але толькі не ў дадзё (спартыўная зала ў каратэ. — **«ЧЗ»**). Пры гэтым упарта займалася. І перажывала, што мой пояс не спяшаецца «цямнець». Трэнер тады выказаў добрую думку: колер не заўсёды з'яўляецца паказчыкам узроўню спартсмена. Можна здаваць экзамены і не назіраць росту, а можна хадзіць з белым поясам, пры гэтым выдатна валодаць тэхнікай і фізічна развівацца, — кажа суразмоўніца.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 05 2020 г.

# ІДЭІ, ШТО СТАНОВЯЦЦА «ПЕРШЫМІ»

*Не прапусці!*

## «Зорка босая йшла па зямлі»

**Нацыянальная бібліятэка абвясціла конкурс для школьнікаў, прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Яго ўдзельнікамі могуць стаць вучні 4—11 класаў. Для гэтага ім трэба зрабіць плакаты з цытатамі паэта і напісаць эсэ.**




Удзельнік чытае творы Рыгора Барадуліна і выбірае любую цытату з творчай спадчыны пісьменніка.

Спампоўвае файл з прапанаваным дызайнерскім рашэннем плаката на партале www.nlb.by, раздрукоўвае і каліграфічна афармляе цытату або стварае сваё мастацкае рашэнне плаката і каліграфічна афармляе цытату.

Піша невялікае эсэ (да 1000 знакаў без прабелаў) з тлумачэннем свайго выбару цытаты паэта.

Скануе творчую работу і дасылае разам з эсэ на электронную пошту konkurs.baradulin85@gmail.com і (альбо) выкладвае ў сацыяльнай сеткі Facebook з хэштэгамі #konkurs_baradulin85 #cytata_baradulin

У электронным лісце трэба паведаміць імя, прозвішча, узрост, горад пражывання, школу і клас, кантактны нумар тэлефона.

Удзельнік дае дазвол на выкарыстанне сваёй конкурснай работы на партале бібліятэкі, у сацыяльных сетках і для публікацыі ў часопісе «Выхаванне і дадатковая адукацыя» з абавязковым пазначэннем аўтара работы.

Конкурсныя работы прымаюцца да 31 ліпеня.

Вынікі конкурсу будуць абвешчаны да 28 жніўня на партале www.nlb.by, а таксама ў жнівеньскім нумары часопіса «Выхаванне і дадатковая адукацыя». У гэтым жа нумары на каляровай укладцы будуць размешчаны найлепшыя конкурсныя работы.

Тры пераможцы, якія зоймуць I—III месцы, будуць адзначаны памятнымі дыпломамі, бясплатнай экскурсіяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (з наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку) для ўсяго класа альбо сяброў удзельніка конкурсу, фотасесіяй падчас экскурсіі, кнігамі, падарункавымі пакетамі з прадукцыяй выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».

Акрамя галоўных пераможцаў будуць адзначаны таксама яшчэ дзесяць найлепшых работ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Герой адзначае, што галоўная задача ініцыятывы — каб беларускай мовы было больш, каб многія ўбачылі, што наша паэзія — гэта не проста літары з падручнікаў...

— У планах зрабіць яшчэ 17 муралаў па Брэсце. Хочацца, каб яны з'яўляліся і ў іншых гарадах. Асабліва ў тых мясцінах, якія былі значнымі для беларускіх творцаў. Пакуль па зразумелых прычынах мы прыпынілі работу, аднак як толькі эпідэміялагічная сітуацыя нармалізуецца, адразу прыступім да яе. Сродкі на працяг ініцыятывы збіраем праз краўдфандынг — гэтыя грошы пойдуць на фарбы, трафарэты і аплату працы мастакам і дызайнерам. Да таго ж, зараз стварылі старонку ў «Інстаграме», каб кожны ахвотны змог прапанаваць нам любы верш, які падабаецца, а мы ў сваю чаргу разгледзім і вырашым, ці падыходзіць ён для выявы на сцяне.

Праект падтрымалі і гарадскія ўлады. З камандай Дзяніса ўжо ўзгаднілі месцы, дзе ў найбліжэйшай будучыні з'явяцца муралы з вершамі Уладзіміра Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына», Яўгеніі Янішчыц «Ты пакліч мяне, пазаві» і Алеся Разанава «Іх далячыні развялі».


Соф'я Федчанка.

**Пятнаццацігадовая Соф'я ФЕДЧАНКА з Мінска** прапануе ўвесці ў школах... парты. Але не звычайныя, а тыя, за якімі трэба стаяць — канторкі.

— Я вучуся ў гімназіі № 4, і мне вельмі падабаецца хадзіць туды на заняткі. Аднак год таму, калі я толькі перайшла ў восьмы клас, даведалася аб захворванні пазваночніка. З-за яго мне нельга доўга сядзець, а школа — гэта, зразумела, перш за ўсё парты і крэслы. Прыйшлося перайсці на індывідуальны план навучання. Гэта няпроста, бо за кароткі прамежак часу я павінна асвойваць інфармацыю самастойна, таму трэба правільна размяркоўваць свой час, — кажа суразмоўніца.

Вось тады ў дзяўчыны і ўзнікла ідэя выкарыстання ў школах канторак. Як толькі Соф'я падзялілася сваёй ініцыятывай з сябрамі і знаёмымі, аказалася, многія хацелі б паспрабаваць вучыцца за імі.

— Нават падлеткі без праблем з апорнарухальным апаратам кажуць аб тым, што іншым часам цяжка выседзець па шэсць, а то і больш урокаў штодня. Таму хацелася б, каб канторкі сталі прафілактыкай і для здаровых дзяцей. Упэўнена, што калі за імі будуць стаяць усе вучні, гэта паспрые развіццю інклюзіўнай культуры — інакш кажучы, мяжа паміж хворымі і здаровымі будзе паступова знікаць, — лічыць дзяўчына.

Дарэчы, канторкамі карыстаюцца работнікі такіх вядомых карпарацый, як Google, Facebook і іншых. У нашай краіне яны таксама прымяняюцца, аднак нячаста.

— Для ўсведамлення карысці такой мэблі патрэбны час, — разважае Соф'я. — Вельмі рада, што мяне падтрымлівае мама, у якой у свой час была траўма пазваночніка. На сёння мая галоўная задача — зрабіць так, каб праблема, на якую я звяртаю ўвагу, была заўважана і іншымі. Зараз распрацоўваю дызайн канторак, калі ўсё будзе гатова, прапаную яго вытворцам. Падрыхтую таксама брашуры для навучальных устаноў, дзе будзе змешчана інфармацыя аб эрганамічнай арганізацыі школьнай прасторы, рэкамендацыі аб тым, як пазбегнуць захворванняў пазваночніка.

Гэта не першая інклюзіўная ініцыятыва Соф'і. Летась разам з матуляй дзяўчына дапамагала збіраць грошы на праект па дапамозе невідушчым дзецям «Казкі ўголас», а таксама наведала канферэнцыю All Inclusive, дзе пазнаёмілася з людзьмі, якія распаўсюджваюць ідэі інклюзіўнасці ў нашай краіне.

А ў паўсядзённасці Соф'я піша музыку, вывучае праграмы па мантажы відэа і вылучае шмат часу на маляванне. «Займаюся ім з пяці гадоў, нават малюю ілюстрацыі для маміных дзіцячых кніг. Пасля дзявятага класа плануюпаступаць у каледж на дызайнерскую ці мастацкую спецыяльнасць», — падзялілася дзяўчына.

У вольны час **вучаніца дзявятага класа віцебскай сярэдняй школы № 12 Анастасія КУНДЗІР** удзельнічае ў школьных канферэнцыях, мерапрыемствах, наведвае тэатральны гурток, займаецца танцамі, выступае на канцэртах. Але асобнае месца ў сэрцы чатырнаццацігадовай дзяўчыны займае беларуская культура.



Анастасія Кундзір.

— Узімку ў родным горадзе праводзіўся адукацыйны крэатон конкурсу «Першыя», я таксама ў ім удзельнічала. Адно з пытанняў да школьнікаў гучала так: «Чаму моладзь не надта цікавіцца музеямі?» Яно стала для мяне штуршком для таго, каб заняцца рэалізацыяй уласнага праекта ў гэтым кірунку, бо лічу, што музеі ў нашай краіне вельмі цікавыя! Проста аб некаторых падзеях накшталт выставак часам няма патрэбнай інфармацыі. Я ж хачу гэта выправіць і пераканаць некаторых маладых людзей, што паход у музей — гэта зусім не сумны занятак.

Сутнасць ідэі ў тым, каб стварыць адзіную базу музеяў Беларусі з дапамогай сайта і мабільнай праграмы. Каб любы карыстальнік змог выбраць менавіта той культурны маршрут па любым горадзе краіны, які яму патрэбны, выходзячы са сваіх інтарэсаў.

### Даведка

«Першыя» — гэта конкурс яскравых ідэй пакалення Z. Цягам навучальнага года школьнікі распрацоўвалі свае праекты ў чатырох тэматычных кірунках — «Экалогія», «Тэхналогіі», «Інклюзія» і «Культура», а таксама бралі ўдзел у крэатонах у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі і Гродне. Спецыяльна для канкурсантаў быў запушчаны першы беларускамоўны падкаст для моладзі, у якім прафесіяналы з розных сфер дзяліліся парадамі па запуску і прэзентацыі праектаў.

Журы конкурсу «Першыя» прагледзела больш за сотню відэазаявак і выбрала дзесяць найлепшых ідэй. Іх аўтары і выйдуць 19 верасня ў знакаміты чырвоны круг TED з дзесяціхвілінная прамовай. Канферэнцыя TEDxYouth@Minsk адбудзецца ў Беларусі другі раз. Па традыцыі прамовы ўсіх спікераў будуць гучаць па-беларуску, бо адна з мэт праекта — пашырэнне выкарыстання беларускай мовы і яе вядомасці ў сусветнай прасторы.

— У ідэале сэрвіс павінен працаваць такім чынам: вы заходзіце на сайт ці ўстанаўліваеце сабе на тэлефон праграму, далей выбіраеце рэгіён ці горад, дзе жывяце або дзе знаходзіцеся ў пэўны момант. Вам даецца тэст, каб вызначыць кола інтарэсаў і прапанаваць спіс музеяў, якія могуць зацікавіць менавіта вас. Атрымліваецца індывідуальная карта, — расказала суразмоўніца.

**Сутнасць ідэі ў тым, каб стварыць адзіную базу музеяў Беларусі з дапамогай сайта і мабільнай праграмы.**

Работа над праектам Насцю чакае доўгая і карпатлівая, таму пра дэдлайн яшчэ гаварыць рана. «Зараз патрэбны спецыялісты, у прыватнасці, праграмісты, гіды, музеяведы і іншыя. Трэба сабраць даныя па ўсіх беларускіх музеях і праанalізаваць іх, устанавіць кантакты з турфірмамі», — падзялілася дзяўчына.

А **сямнаццацігадовы мінчанін Самуіл АЛЕКСІН** прапануе ўвесці ў школьную праграму курс робататэхнічнай адукаванасці.

Тое, што хлопцу прыйшла ў галаву менавіта такая задума, нядзіўна. Суразмоўнік з дзевяці гадоў займаецца робататэхнікай, стварае робатаў, мае пэўны вопыт і дасягненні, з апошніх — першае месца ў складзе беларускай каманды ў міжнародным спаборніцтве па робататэхніцы First Global Challenge-2019, якое прайшло ў Дубаі. Краін-удзельніц тады было 180. Але вернемся да праекта.

— Хочацца, каб у найбліжэйшай будучыні настаўнікі давалі як тэарэтычныя, так і практычныя веды па робататэхніцы, разам з вучнямі спрабавалі збіраць ці распрацоўваць уласныя канструкцыі. Тэхналогіі развіваюцца вельмі хутка, і трэба за імі паспяваць. Аднак пакуль што курсы па робататэхніцы даступныя далёка не ўсім. Упэўнены, што як прадмет у школьнай праграме робататэхніка таксама неабходная, каб сучасныя падлеткі маглі вучыцца таму, што сапраўды актуальна на цяперашні момант, развівалі крэатыўнае і практычнае мысленне, — растлумачыў сваю задуму Самуіл.

Акрамя робататэхнікі, хлопец любіць вывучаць англійскую, польскую і нямецкую мовы, яму падабаюцца гісторыя і сацыялогія. Самуіл заўсёды за актыўны адпачынак, таму пастаянна займаецца спортам. А яшчэ вялікую ўвагу аддае роднай беларускай мове, разам з сябрамі размаўляе на ёй штодня.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**


Самуіл Алексін.

*Новыя старты*

# Хто тут апошні ў «Пачынаючага фермера» запісацца?

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі падоўжыў да 30 мая прыём заявак на ўдзел у міжнароднай бізнес-гульні «Пачынаючы фермер»**

**Першапачаткова планавалася завяршыць яго ў канцы красавіка, але праект выклікаў вялікі рэзананс у маладзёжным асяроддзі. Да арганізатараў звярнуліся маладыя аграрыі, якія завяршаюць распрацоўку сваіх праектаў і хочуць узяць удзел у конкурсе. Ім пайшлі насустрач і чакаюць заявак да 30 мая.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

У БРСМ лічаць, што канкурэнцыя ў гульні будзе высокая. Гэта відаць ужо па тых заяўках, якія паступілі. Напрыклад, моладзь Брэсцкай вобласці распрацавала бізнес-планы «Хербал Лайн», «Малінавыя плантацыі», «Вішнёвы сад як міні-фермерская гаспадарка і дадатковае азеляненне горада», «Фермерская гаспадарка «Прыгажосць здароўя» па вырошчванні эхінацеі і лаванды», «Пчалярства», «Стварэнне рыбаводчай гаспадаркі «Олтушскае», а таксама план па вырошчванні бульбы.

Нагадаем, што інтэлектуальная бізнес-гульня «Пачынаючы фермер» была прапанавана Расійскім саюзам сельскай моладзі падчас Міжнароднага кангрэса сельскай моладзі ў лютым гэтага года ў Казані. Праект аб'ядноўвае школьнікаў, якія жывуць у вёсцы, студэнтаў устаноў адукацыі сельгаспрофілю, маладых спецыялістаў аграрнага сектара, а таксама прадпрымальнікаў сферы АПК. Як паказала практыка, гульня спрыяе развіццю ў сельскай моладзі навыкаў бізнес-планавання, выпрацоўцы кіраўніцкіх рашэнняў і ўменню працаваць у камандзе.

Да гульні дапускаюцца каманды да пяці чалавек ва ўзросце ад 14 да 31 года. Бізнес-праекты будуць разглядацца ў пяці намінацыях: жывёлагадоўля, птушкагадоўля, рыбаводства і аквакультуры, пчалярства; раслінаводства, садоўніцтва, ландшафтны дызайн; паляводства, агародніцтва; агратурызм; сельскагаспадарчая кааперацыя і свабодная тэма.

Гульня ўключае некалькі этапаў: абласны, нацыянальны і міжнародны. У рэспубліканскім туры найлепшым камандам трэба будзе абараніць свае праекты перад экспертным саветам у рэжыме анлайн. Міжнародны вочны этап з абаронай праектаў перад экспертным саветам адбудзецца ў адным з рэгіёнаў Расіі. Удзельнікі гульні атрымаюць ацэнку сваіх ідэй, пераможцы будуць узнагароджаны дыпломамі і памятнымі падарункамі. Плануецца, што іх запросяць на стажыроўку ў краіны-ўдзельніцы — Беларусь, Расію, Кыргызстан, Казахстан і Арменію.

У Беларусі арганізатарам гульні выступае БРСМ пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Кансультацыйную дапамогу па правядзенні гульні аказвае Расійскі саюз сельскай моладзі. У адпаведнасці з палажэннем, матэрыялы ўдзельнікаў гульні з захаваннем аўтарства будуць выкарыстаны для публікацыі на афіцыйных інтэрнэт-рэсурсах і пляцоўках маладзёжных арганізацый дзвюх краін у сацсетках.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Пасябраваць з музай*

# Буктрэйлеры — Году малой радзімы

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі працягнуў творчы конкурс «Кніга з экрана» і запрасіў школьнікаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, студэнцкую і працуючую моладзь да ўдзелу ў другім сезоне.**

Гэта могуць быць як індывідуальныя канкурсанты, так і творчыя групы хлопчыкаў і дзяўчынак. Другая частка праекта прысвечана Году малой радзімы, а паўтарахвілінныя міні-фільмы, створаныя маладымі сцэнарыстамі, аператарамі і рэжысёрамі, якія папулярызуюць тую ці іншую кнігу, прапанавана зрабіць па творах беларускіх аўтараў. Арганізатары выказваюць надзею, што да конкурсу па стварэнні кніжных трэйлераў далучацца і айчынныя выдавецтвы.

Другі сезон стартаваў 18 мая. Вынікі плануецца падвесці ў пачатку жніўня. Традыцыйна конкурс пройдзе ў тры этапы: да 28 чэрвеня раённыя, да 24 ліпеня абласныя і да 8 жніўня — рэспубліканскі. Ацэніць творчыя работы прафесійнае журы. Узнагароджанне пераможцаў першага і другога сезонаў адбудзецца ў верасні падчас Дня беларускага пісьменства, які сёлета плануецца правесці ў Бялынічах, паведамілі ў ЦК БРСМ.

Першы сезон конкурсу быў прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі. У ім бралі ўдзел 360 творчых работ, падрыхтаваных навучэнскай і працуючай моладдзю. На перамогу ў рэспубліканскім фінале прэтэндаваў 91 буктрэйлер па кнігах ваеннай тэматыкі, 48 узялі ўдзел у спецыяльнай намінацыі «Найлепшы буктрэйлер анлайн».

Арганізатарамі рэспубліканскага творчага конкурсу выступаюць БРСМ, Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Нацыянальная бібліятэка. Мэта — папулярызацыя чытання і творчасці сучасных айчынных аўтараў, актуалізацыя цікавасці да мастацкай літаратуры, стварэнне рэкламнага прадукту для кніг.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Рух ад сэрца*

# «ГЭТА ПАВІННА ІСЦІ З ГЛЫБІНІ ДУШЫ»




**— Спачатку сам задаваўся пытаннем, для чаго маладыя людзі гэтым займаюцца, што імі кіруе. Але варта было толькі паспрабаваць, як зразумеў: мне такой атыўнасці таксама не хапала. І ўжо нельга спыніцца, — шчыра расказвае дваццацідзевяцігадовы Максім КАСОВІЧ.**

Ён працуе намеснікам начальніка механазборачнага цэха № 1 ААТ «Барысаўскі завод агрэгатаў» і там узначальвае пярвічку БРСМ. Таксама важную частку яго жыцця займае добраахвотніцкі рух: хлопец дапамагае пажылым, прымае ўдзел у зборы грошай для хворых дзяцей, удзельнічае ў розных акцыях, мерапрыемствах і конкурсах Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. У адным з такіх, а менавіта ў рэспубліканскім этапе «Валанцёра года — 2019», Максім стаў адным з пераможцаў у намінацыі «Асабісты ўклад сярод працуючай моладзі».

— Мая дзейнасць у гэтай сферы пачалася летась, калі БРСМ традыцыйна запусціў рэспубліканскую акцыю «Аднаўленне святынь. Крыніцы Беларусі». Тады мне пашчасціла пабываць у Свята-Успенскім мужчынскім манастыры на Мсціслаўшчыне, — прыгадаў суразмоўнік. — Праграма была разлічана на два дні: у першы нас чакалі трэнінгі на камандную згуртаванасць і экскурсія, у другі — добраўпарадкаванне храма. Мы заклалі фруктовы сад, і, самае галоўнае, прывялі ў парадак адну з чатырох гаючых крыніц, якую ў народзе называюць Ефрасіннеўскай. Да яе прыязджаюць паломнікі не толькі з Беларусі, але і з іншых краін. Падчас гэтай акцыі я атрымаў станоўчыя эмоцыі і завёў шмат новых знаёмстваў, нават сяброў, з якімі кантактуем дагэтуль. Праект адназначна даў старт майму захапленню валанцёрствам.

І пайшло: шматлікія акцыі, сярод якіх «Беларусь памятае», «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям», «Моладзь за чысціню гарадоў і вёсак»... Самая блізкая сэрцу для Максіма — «Цуды на Каляды», якая штогод стартуе 5 снежня, у Міжнародны дзень добраахвотнікаў.

— У гэты дзень валанцёры з усёй краіны арганізоўваюць святочныя праграмы, конкурсы, адрасныя віншаванні для выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, прыёмнікаў-размеркавальнікаў, дзяцей-сірот, дзяцей, з абмежаванымі магчымасцямі, тых, хто знаходзіцца ў рэабілітацыйных цэнтрах, бальніцах. Калі глядзіш на іх, размаўляеш з імі, не можаш застацца абыякавы. Ёсць адчуванне, што дапамога такім дзецям — толькі маленькая частка таго, што мы можам зрабіць для іх, — лічыць суразмоўнік.

У сувязі з эпідэміялагічным становішчам у краіне валанцёрскі рух «Добрае Сэрца» сумесна з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Барысава, дзе зараз жыве герой, аказвае дапамогу пажылым людзям і ветэранам.



У гэтым прымае ўдзел і Максім. «Дастаўляем прадукты харчавання, медыкаменты, маскі і антысептыкі, аплачваем камунальныя паслугі і завозім дзядуль і бабуль на пошту, калі трэба атрымаць пенсію».

Хлопец упэўнены: кожны добраахвотніцкі праект, кожная акцыя — гэта магчымасць праявіць сваё найлепшыя якасці.

— Валанцёр — гэта міласэрны, бескарыслівы, уважлівы да іншых чалавек. Ён павінен быць ініцыятыўны, хутка арыентавацца ў складанай сітуацыі, знаходзіць нестандартныя рашэнні, умець вырашаць канфлікты. І, самае галоўнае, усё гэта павінна ісці з глыбіні душы і сэрца. Менавіта я, калі дапамагаю іншым, адчуваю душэўны спакой і радасць ад таго, што камусьці зрабіў добрую справу. А яшчэ прыходзіць усведамленне, што многія матэрыяльныя набыткі — гэта зусім не каштоўнасці.

Сваім прыкладам Максім натхняе тых, хто побач. Знаёмыя, сябры, гледзячы на яго, хутка пачалі далучацца да добраахвотніцкіх ініцыятыў.

— Спачатку прыцягнуў да валанцёрскага руху калег, пасля — жонку і сямігадовую дачку. Аднойчы ўзяў малую з сабой на пасадку алеі дрэў, ёй вельмі спадабалася. З таго часу Аліса разам з намі ўдзельнічае ў многіх акцыях. Лічу, што пры любой магчымасці трэба паказваць станоўчы прыклад дзецям.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва героя.**

*Ход канём*

# МАСТАЦТВА ПАСТАВІЦЬ МАТ

**Удзельнікі гуртка па шахматах і шашках дзяржынскай гімназіі № 1 ужо не раз перамагалі ў гарадскіх, раённых і абласных спаборніцтвах. Двое — Ілья КАНДРАШОЎ, вучань 6 класа, і Ягор НЕМЧАНКА, вучань 8 класа, — з'яўляюцца «старажыламі», якія ўжо паспелі спазнаць усе тонкасці і складанасці шахматна-шашачных баёў.**

— Шахматамі і шашкамі я пачаў займацца яшчэ ў гадоў пяць, калі быў у дзіцячым садку. Сказаў бацькам, што мне гэта цікава, і яны адвялі мяне ў гуртоК. У школе працягнуў заняткі. Цяпер уваходжу ў склад каманды, і мы часта гуляем пад сцягам сваёй гімназіі, бывае, выступаем і за родны горад, — расказвае Ягор.

Юнак нават браў удзел у шахматным турніры ў Маскве. А сваім галоўным дасягненнем лічыць перамогу на спаборніцтвах у Оршы і атрыманне першага спартыўнага разраду.

— Разнавіднасцяў шахматных і шашачных турніраў вельмі шмат. Мне больш падабаюцца камандныя. У іх у мяне з'яўляецца дадатковы стымул да перамогі. Паводле ўмоў, заўсёды павінна быць максімум чатыры хлопчыкі і абавязкова хоць адна дзяўчынка. Без яе каманду дыскваліфікуюць.



Ілья і Ягор (злева направа).

А вось чатыры дзяўчынкі і адзін хлопчык — дапушчальны варыянт. Пры любым складзе я застаюся самым старэйшым гульцом і лічу сваім абавязкам супакоіць і падбадзёрыць астатніх. Калі раптам мы прайграем, то заўсёды тлумачу, што перамога — гэта не так важна. І калі не атрымалася зараз, то варта трохі пазаймацца, і наступным разам усё выйдзе.

Ягор прызнаецца, што цяпер аддае менш часу заняткам шахматамі і шашкамі, чым раней, бо старанна займаецца вучобай. Будучую прафесію хоча звязаць з праграмаваннем.

Другі «старажыл», Ілья Кандрашоў, хоць і малодшы за свайго сябра, але ўпэўнена наступае таму на пяткі. І ў свае дванаццаць гадоў ужо мае трэці разрад. Яго таксама, як і Ягора, у дзіцячым садку бацькі прывялі на заняткі, а пазней ён заняў заслужанае месца ў школьнай камандзе.

— Хоць я і займаюся ў шахматна-шашачным клубе, гуляць мне больш падабаецца ў шахматы. Там больш фігур, а значыць, больш магчымасцяў перамагчы саперніка *(смяецца)*. У шахматах, акрамя камандных і адзіночных спаборніцтваў, ёсць віды турніраў, класіфікаваных па часе. Я ўдзельнічаў у такіх, дзе партыя доўжылася пяць хвілін: там усяго секунд дваццаць, каб зрабіць ход. Яшчэ былі па пятнаццаць хвілін, ну і мае любімыя, дзе на партыю даецца паўгадзіны. У такой гульні паспяваеш добра прадумаць ход і запісаць дзеянні саперніка, каб потым разабраць усе свае і яго памылкі з выкладчыкам і больш іх не паўтараць.

Ілья расказвае, што самае складанае ў гэтым відзе спорту для яго — рашэнне шахматных задач. Часам ён траціць амаль цэлы занятак у гуртку для іх разбору і знаходжання правільнага рашэння. І ў чым яны салідарныя з Ягорам, дык гэта ў тым, што шахматна-шашачны спорт патрабуе вялікіх высілкаў і не падыходзіць для людзей з гуманітарным складам розуму.

— Навучыць хадзіць пешкамі можна любога. А вось паставіць мат — гэта ўжо цэлае мастацтва. Каб дасягнуць такога майстэрства, трэба шмат займацца. У нашым гуртку мы сустракаемся два-тры разы на тыдзень. Трэнер Сяргей Рыгоравіч Усніч кожны раз прапануе для нас новыя цікавыя задачы і партыі. Наогул у гурток ходзіць вельмі шмат дзяцей рознага ўзросту, кожны год нашы рады папаўняюць першакласнікі. Акрамя трэнера рыхтавацца да спаборніцтваў за гонар гімназіі нам дапамагае настаўнік фізкультуры Павел Вітальевіч Леўшукоў. Ён заўсёды падбадзёрвае і заахвочвае за ўдалыя выступленні. У вольны час я стараюся трэніравацца дома, гуляю з татам і ў анлайн-шахматы і шашкі на камп'ютары. У будучыні хачу гуляць, як мой кумір Каспараў, і веру, што калі старацца і трэніравацца, то ўсё атрымаецца, — падзяліўся Ілья.

Зараз хлопцы рыхтуюцца да новых спаборніцтваў. А мы жадаем ім поспехаў і новых перамог.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка III курса**
**Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**
**культуры і мастацтваў.**

# ДАДЗЁ, ДАЯНГ І... ТЭЛЕБАЧАННЕ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Падзея, якую Вікторыя Шахно будзе памятаць усё жыццё, — гэта прысваенне звання кандыдата ў майстры спорту. Набліжалася Рэспубліканская ўніверсіяда па тэквандо. Спартсменка пра яе яшчэ не ведала, працягваючы займацца каратэ. Прыблізна за тыдзень да спаборніцтваў трэнер падышоў да дзяўчыны і сказаў: «Ведаеш, што ты ў зборнай па тэквандо? Рыхтуйся».

**Цяпер кожная трэніроўка ў выхаванцаў асацыюецца з Rammstein, жорсткім шпагатам і болем...**

Тэквандо не каратэ, у іх шмат адрозненняў. За некалькі дзён Вікторыя павінна была асвоіць новы від спорту.

— ...Я нібы ў тумане, бачу сваё прозвішча на табло, выходжу ў няўручнай экіпіроўцы на даянг (пляцоўка для бою ў тэквандо. — **«ЧЗ».**), з'яўляецца саперніца, якая да гэтага здавалася мне хлопцам... Позірк у яе быў упэўнены. Рэферы чакаў майго выхаду, а я нават правілаў паядынку не ведала, — прызнаецца дзяўчына. — Трэнер літаральна выпіхнуў уперад... Усяго было тры баі. Ужо пасля другога не адчувала ног. Наперадзе — фінал, вырашаецца лёс: альбо стануўлося сярэбраным прызёрам і сыходжу «ў цень», альбо іду да канца, бяру «золата» і атрымліваю званне КМС. З даянга выходзіла з пераломам кісці рукі, мноствам сінякоў, але пераможніцай. У мяне быў козыр — група падтрымкі сяброў-каратыстаў і тэквандыстаў, якія падбадзёрвалі ў напружаныя хвіліны. А пра пералом даведалася толькі ў бальніцы, куды мяне адвезлі, бо рука зусім ссінела і распухла. Увесь астатні вечар каталася на інвалідная калясцы і пужала гісторыямі ў «Інстаграме»...

## ТРЭНІРОЎКІ ПАД ЦЯЖКУЮ МУЗЫКУ

Так Вікторыя адкрыла сябе ў карэйскім адзінаборстве. Па парадах старэйшых дзяўчына атрымлівае трэнерскую адукацыю: паспяхова скончыўшы журфак, паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры і цяпер выступае ў ролі памочніка галоўнага трэнера секцыі па тэквандо.

— Мне падабаецца. Я імкнуся аддаваць вучням тое, чым сама валодаю. Многія з нуля прыходзяць займацца, і прыемна адчуваць, што ты можаш падзяліцца вопытам і дапамагчы чалавеку развівацца ў гэтым кірунку, — кажа дзяўчына. — Што датычыцца трэнерскага майстэрства, дык яно найперш прадугледжвае наяўнасць цярпення. Трэба любіць сваіх выхаванцаў, бо што для цябе проста, для іх можа быць напачатку недасягальна. Часам даводзіцца паказваць адно і тое ж па некалькі разоў. Пасля адчуваю такую асалоду, калі ў іх нарэшце нешта атрымліваецца!

Трэніроўкі маладая трэнер вядзе па пэўным стандарце: размінка, расцяжка, асноўная частка і «запампоўка». Большасць разміначных практыкаванняў дзяўчына запазычыла ў каратэ. Паралельна назірала за тэквандыстамі, праглядала ролікі з трэніровак у гэтым відзе спорту.

А яшчэ Вікторыя прынесла ў спартыўную залу любоў да цяжкай музыкі. Цяпер кожная трэніроўка ў выхаванцаў асацыюецца з Rammstein, жорсткім шпагатам і болем... Дзяўчына ўпэўнена: каб чалавека штосьці «дайшло», трэба знайсці з ім агульную мову, стварыць адпаведную атмасферу, у якой людзі б пакутавалі фізічна, але адпачывалі маральна.

Калі чалавек знаёміцца з адзінаборствам, вопытныя трэнеры не спяшаюцца адпраўляць яго на спаборніцтвы. Важна адчуць стыль, набыць фізічную сілу. А на турнірах выкоўваюць характар.



Пасля трэніроўкі з сэнсэем Вікторыя ператвараецца ў карэспандэнта.

**«Перажывала, што мой пояс не спяшаецца «цямнець». Трэнер тады выказаў: колер не заўсёды з'яўляецца паказчыкам узроўню спартсмена».**

Нягледзячы на тое што Вікторыя толькі атрымлівае трэнерскую адукацыю, вучні да яе ставяцца з павагай. Розніца ва ўзросце паміж імі невялікая, атмасфера панує сяброўская.

— Я не ўзношу сябе вышэй за іх, і яны да мяне ставяцца з павагай. Некаторыя нават на «вы»... *(усміхаецца)*. Зразумела, рамкі ёсць: на трэніроўцы павінна быць дысцыпліна. А ўжо пасля мы жартуем і сустракаемся па-за сценамі залы.

## TELEKOMPANY_VID ПРАДСТАЎЛЯЕ...

У сваёй журналісцкай дзейнасці Вікторыя таксама любіць адрэналін. Яна спрабавала сябе ў газеце, пасля на радыё. Пад канец вучобы трапіла на тэлеканал «Беларусь 5», дзе прадэманстравала цікавасць да адзінаборстваў. Студэнтку накіравалі ў праект «Фактар сілы», там дзяўчына змагла выконваць заданні па душы: рабіць сюжэты пра спаборніцтвы па каратэ, тэквандо, тайскім боксе... Задаючы пытанні атлету, Вікторыя не толькі рыхтуе інтэрв'ю для тэлебачання, але і атрымлівае парады для сябе, бо штосьці ёй карысна як трэнеру, штосьці — як спартсмену. Таму матэрыялы атрымліваюцца жывыя. Дзяўчына прызнаецца, што такім чынам сумяшчае прыемнае з карысным.

**Задаючы пытанні, Вікторыя не толькі рыхтуе інтэрв'ю для тэлебачання, але і атрымлівае парады для сябе.**

— У 2017 годзе я стала кандыдатам у майстры спорту па тэквандо і на той момант падумаць не магла, як тое паўплывае на маё жыццё. Апроч трэніроўкі студэнтаў, паспела не раз выступіць на спаборніцтвах і чэмпіянатах Беларусі. Часам мы проста не верым у свае сілы, а гэта вялікая памылка! Дзякуючы сябрам, трэнеру ў мяне з'яўляюцца сілы, жаданне, ставяцца новыя мэты. Пакуль маладая, імкнуся браць ад жыцця ўсё, і нават калі апускаюцца рукі, не здаюся. Пасля гэтага ўдвая мацнееш.

Дзяўчына актыўна вядзе асабісты блог у «Інстаграме» пад назвай Telekompany_vid, дзе таксама транслюе баі, публікуе часткі інтэрв'ю. Назву прыдумала невыпадкова — згадайце выяву тэлекампаніі ВІД: страшнаваты твар, які з'яўляўся на экранах перад «Полем цудаў», «Чакай мяне» і іншымі перадачамі, што ўжо сталі легендамі. За сур'ёзны позірк, валявы характар і «гульку», якую дзяўчына любіла насіць на галаве, яе так называлі некаторы час. Мянушку абыграла — атрымалася арыгінальна і да месца.

Упартая і моцная духам, Вікторыя і надалей плануе развіваць сябе ў адзінаборствах — бачыць іх знутры як трэнер і спартсмен, а таксама ствараць сюжэты пра ўсходнія віды спорту.

**Кацярына КАСЦЕВІЧ,**
**студэнтка IV курса факультэта**
**журналістыкі БДУ.**

*Эксперыментальная пляцоўка*

# «ПУБЛІКАЦЫЯ МАЛАДОГА АЎТАРА — СПРОБА ПРАДКАЗАННЯ»

**Конкурс «Першацвет», які дапамагае адкрываць таленты маладых літаратараў-пачаткоўцаў, з'явіўся ў 2016 годзе. За гэты час выйшлі чатыры альманахі з творами сучасных пісьменнікаў і паэтаў. Як заўважыць будучага класіка, чаму ў літаратуру прыходзіць усё больш дзяўчат, а маладыя не рэкламуюць творчасць адно аднаго, расказаў член экспертнага савета «Першацвета», дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», празаік і паэт Алесь БАДАК.**

***— Конкурсу ўжо чатыры гады. Як усё пачыналася?***

— Ініцыятар і арганізатар «Першацвета» — Міністэрства інфармацыі. Падхапіў справу Выдавецкі дом «Звязда» — часопісы «Маладосць», «Полымя», «Нёман», газета «ЛіМ». А крыху пазней да конкурсу падключылася «Мастацкая літаратура». Ідэя выдаваць альманах пераможцаў (які таксама называецца «Першацвет») да ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання належала менавіта выдавецтву. Мы таксама вырашылі друкаваць у зборніку не толькі творы, дзякуючы якім удзельнікі перамаглі, а прадстаўляць аўтараў больш шырока: калі ў конкурсе можа спаборнічаць адзін верш, то чаму б нам не апублікаваць невялікую падборку? Многія з новага пакалення літаратараў, як паказваюць ужо чатыры творчыя спаборніцтвы, шырокаму чытачу невядомыя, хоць ёсць сярод канкурсантаў і выключэнні. А можа, для некаторых і крыўдна, калі іх называюць маладымі аўтарамі: цяпер у літаратуры вельмі хутка адбываецца сталенне. Я кажу не пра ўзрост па пашпарце, а менавіта пра ўзрост літаратурны. У мінулых «Першацветах» удзельнічалі Маргарыта Латышкевіч, Станіслава Умец, якія сёння ўжо члены Саюза пісьменнікаў і выдалі кніжкі — у тым ліку і ў «Мастацкай літаратуры». Мы на сябе таксама ўзялі абавязкі, ужо па-за межамі літаратурнага конкурсу, выдаваць зборнікі найбольш арыгінальных аўтараў. З'явілася новая серыя «Час ХХІ». 21 — гэта цудоўны ўзрост у літаратуры, калі ўжо нешта маеш сказаць і сур'ёзна пра сябе заявіць. Калі мы паглядзім на гісторыю беларускай літаратуры, то многія паэты і празаікі ўжо ў такім узросце пісалі творы, якія потым станавіліся класічнымі. І вядома ж, 21 — гэта і наша стагоддзе. Сучасная літаратура адрозніваецца ад той, што стваралася ў мінулым.

***— Пераможцаў выбірае экспертны савет. Ці спрачаецеся вы паміж сабой?***

— У яго склад уваходзяць супрацоўнікі выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Выдавецкага дома «Звязда». Бывае і такое, што камусьці спадабалася, а іншаму — не. Але ў такіх выпадках дапамагае галасаванне — выбіраем пераможцаў большасцю галасоў. Часам думкі, канешне, могуць не супадаць. Хоць калі імя яркае, цікавае, то тут, як правіла, мы аднадумцы, бо члены журы — людзі невыпадковыя, яны штодзённа працуюць з рукапісамі. Магчыма і такое, што мы кагосьці недаацанілі, а потым яна ці ён стане вядомым. Але гэта паняцце даволі ўмоўнае. Можна быць вядомым у «Фэйсбуку», на якім-небудзь літаратурным сайце, можна быць вядомым у вузкім коле чытачоў, якія гуртуюцца вакол выдання. Можа быць і такое, што малады аўтар не перамог у конкурсе «Першацвет», але перамог у якім-небудзь іншым. Літаратура суб'ектыўная. Калі звярнуцца да класікі, многія творы спачатку не былі заўважаны і прыняты рэдакцыямі. Усё бывае, але ж «Першацвет» — гэта не конкурс, які дае адзіны пропуск у вялікую літаратуру. У яе можна прыйсці самымі рознымі шляхамі. Была ў нас у «Мастацкай літаратуры» ідэя вярнуць серыю «Першая кніга паэта», папулярную ў 70—80-я гады ХХ стагоддзя. На жаль, з гэтага нічога не атрымалася: мы не знайшлі аўтараў, якія б падыходзілі да гэтай задумы. Па-першае, трэба, каб гэта была сапраўды таленавітая паэзія. А па-другое, аказалася, што сёння не так проста адшукаць тых самых таленавітых маладых аўтараў (каб выходзіла серыя, іх трэба знаходзіць штогод па некалькі), якія б у свае юныя гады яшчэ не паспелі дэбютаваць уласным зборнічкам. У гэтым літаратурнай моладзі вельмі дапамагае Міхась Паўлавіч Пазнякоў у Мінскім гарадскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Там кожны год выходзіць па некалькі кніжак маладых. І мы падумалі, што гнацца, хто першы завалодае рукапісам маладога паэта, наўрад ці будзе на карысць самой літаратуры.

***— Ці сустракалі твор за ўсе гады існавання «Першацвета», які б вас вельмі здзівіў, пасля якога вы падумалі: «Гэта новае слова ў сучаснай літаратуры»?***


Фота з адкрытых крыніц.

— Я ўжо назваў прозвішчы дзвюх аўтарак — Маргарыты Латышкевіч і Станіславы Умец. Прычым жаночыя. Сёння з літаратурай адбываецца нешта загадкавае для мяне: вельмі шмат прыходзіць дзяўчат. Яны заўсёды былі, але раней, як правіла, у паэзіі. Сёння ж шмат хто з іх піша прозу, што лічылася заўсёды найперш мужчынскім заняткам. Гэты працэс фемінізацыі накладае адбітак і на саму літаратуру, дзяўчаты прыўносяць нешта новае, сваё. Прычым ні ў якім разе не хачу сказаць гэта ў адмоўным сэнсе, бо ёсць такое паняцце «жаночы раман». Ды насамрэч яго могуць пісаць і мужчыны. Кажу якраз пра літаратуру, якая не мае палавых прыкмет. А сённяшнія пісьменніцы знаходзяць сябе і ў фэнтэзі, і ў дэтэктывах, і ва ўсіх іншых жанрах. Галоўнае — ёсць пошукі. У традыцыйнай літаратуры сказаць новае вельмі цяжка, і многія збіваюцца на вядомыя тэмы, матывы. Такая небяспека заўсёды была, але тут трэба мець на ўвазе, што ў 20—21 год прозу пісаць вельмі цяжка, бо калі вершы — гэта ў асноўным пачуццё, то проза — работа з думкамі і жыццёвым вопытам. Апошняга ў 21 год, вядома, небагата, але пошук праз новыя стылі дазваляе кампенсаваць гэты недахоп.

***— Я вас разумею! Мне 21, і я таксама ўдзельнічала ў конкурсе. Пастаянна пачынаю нешта пісаць, але вельмі рэдка дапісваю — не хапае цярпення.***

— Дык цяпер модна пісаць мініяцюры, там вялікага цярпення не трэба. Але калі сур'ёзна, кароткая форма сама па сабе вельмі каварная. Як і модны сёння жанр нон-фікшн, які запаланіў сацыяльныя сеткі. З боку яно ж добра відаць: як толькі напісалася, адразу надрукавалася. Вельмі мала работы са стылем, словам, часам недаравальныя недакладнасці, граматычныя памылкі...

***— Значыць, вы не прыхільнік фэйсбучнай літаратуры, Андруся Горвата як яркага яе прадстаўніка, напрыклад?***

— Я не тое што не прыхільнік, але стаўлюся да гэтага з пэўнай асцярогай. Цяпер многія гатовы кожны свой запіс у «Фэйсбуку» называць літаратурай у самым высокім значэнні гэтага слова. Аднак літаратура — гэта не толькі «пра што», але і «як». Гэта культура мовы, гэта ўменне паставіць словы ў такім парадку, што яны пачынаюць зіхацець, як раса на сонцы. Так умеў пісаць Янка Брыль. А ўвогуле, у беларускай літаратуры такія кароткія формы выкарыстоўваліся яшчэ на пачатку ХХ стагоддзя — у Змітрака Бядулі, Якуба Коласа. Так што нічога новага ў прыродзе не бывае.

***— Вы казалі, што ўсё больш дзяўчат у літаратуры. А куды падзеліся хлопцы?***

— Іх таксама шмат. Але, можа быць, прадстаўніцы прыгожага полу больш заўважныя, бо іх раней было менш. Калісьці ў літаратуру ішлі пераважна з філфака, а сёння — адусюль. І вельмі мала па гэтай прычыне застаецца: «Я хачу стаць пісьменнікам, дай я паспрабую напісаць апавяданне, раман, аповесць». Напісаў, не надрукавалі, яшчэ напісаў — зноў не надрукавалі. Ну і кінуў, стаў займацца нечым іншым. Раней часцей выбіралі прафесію на ўсё жыццё. Поспех дасягаецца неймаверна цяжкай працай. Нерэальна нешта пісаць лёгка, на хаду, а потым атрымаць вялікія грошы і вядомасць. Кніжны рынак перанасычаны, і здзівіць чытача, заняць на ім сваю нішу вельмі складана. У савецкі час кожная спроба эксперыментатарства ў літаратуры, пошук новых формаў прыводзілі да абурэння афіцыёзнай крытыкі, але і выклікалі цікавасць сярод сапраўдных аматараў мастацкага слова. Сёння няма такой крытыкі, няма адпаведных стандартаў, якія вызначаюць шлях пісьменніка, але і прыцягнуць увагу чытача значна складаней. Прычым не толькі звычайнага. Мне здаецца, самі маладыя аўтары нейк мала цікавяцца творчасцю адно аднаго. Ва ўсякім разе, значна менш, чым, скажам, у часы, калі я пачаў друкавацца, — на пачатку 1980-х гадоў. Тады ўсе ведалі, якая кніжка выйшла ў яго равесніка, чыталі і абмяркоўвалі публікацыі ў «Полымі», «ЛіМе», «Маладосці». Я па сёння памятаю раннія творы многіх маіх аднагодкаў, якія прачытаў больш за трыццаць гадоў таму! І захоўваю ўсе іх кнігі, якія тады выходзілі. Можа быць, у 80-я нас было менш, і кніг выходзіла менш, таму мы і ведалі лепш адно аднаго. Але, хутчэй за ўсё, гэта палова праўды. Другая палова ў тым, што сённяшняя літаратурная моладзь больш прапаведуе індывідуалістычны шлях на Парнас, яна больш «разнашэрсная», таму разбітая па нейкіх дробных групоўках па інтарэсах. Прынамсі, мне цяжка ўявіць, каб сёння з'явілася літаратурная суполка накшталт «Тутэйшых», якія шумна заявілі пра сябе ў другой палове 80-х.

Памятаю адзін круглы стол з удзелам маладых аўтараў. Я папрасіў іх назваць адзін-два творы сваіх равеснікаў, якія праз час могуць з'явіцца ў школьнай хрэстаматыі. Ніхто не назваў. Хоць у нас вельмі шмат літаратурнай моладзі, шмат пішуць, шмат друкуюць. А вось гэтых «залацінак» ніхто не шукае. Пры тым, што вельмі многія класічныя вершы пішуцца акурат у маладым узросце, узяць хоць Аркадзя Куляшова, Рыгора Барадуліна, ды каго заўгодна!

***— Вось вы прыгадалі пару імён «Першацвету». Можа, яшчэ некалькі «надзей беларускай літаратуры» згадаеце?***

— Паколькі я член журы, ведаю ўсіх па імёнах. Усіх чытаў, і выпадковых людзей тут няма. Ёсць больш цікавыя творы і менш цікавыя. Маладая паэзія і маладая проза няроўныя: пакуль чалавек выпрацуе свой стыль, рытм, праходзіць шмат часу. Спачатку малады паэт бярэ нешта, напрыклад, ад Максіма Багдановіча, але праходзіць літаральна некалькі гадоў, і ён адкрывае для сябе Міхася Стральцова і трапляе пад яго ўплыў. Ды не заўважае нават, што пачынае пісаць па-іншаму. Для маладых гэта вельмі характэрна. Калі чытаеш іх творы, ацэньваеш з нейкім умоўным «авансам». Заўсёды стараюся за тым, што даслаў пачатковец, убачыць перспектыву. Знаходзіш у вялікім вершы адзін радок, які цябе кранае, і разумееш: з гэтага радка можа вырасці добры паэт, можа, нават класік. Калі ёсць у апавяданні (не самым цікавым ці ўзрушальным) незвычайная дэталька, думка — ура, з яго можа выйсці харошы празаік. Часта маладыя бачаць тое, чаго сталыя аўтары ўжо не заўважаюць.

***— Атрымліваецца, вельмі часта публікацыя маладога аўтара — гэта аванс?***

— Я б сказаў, што гэта спроба прадказання, ці атрымаецца з чалавека пісьменнік, якім мы ўсе будзем ганарыцца. Але калі б вам было не 21, а 71, я б думаў па-іншаму. У першым выпадку спадзяюся на перспектыву. А ў другім — акцэнтую ўвагу на недахопах: калі чалавек да сталых гадоў піша неахайна, паспешліва, павярхоўна, то ці хопіць яму часу, каб стаць сапраўдным майстрам? Таму на кожнага аўтара з гэтых чатырох альманахаў ёсць спадзеў. Іншая справа, што можа быць і наадварот. Прачытаеш верш — ах, як ён табе падабаецца! Але праходзіць год, два, пяць, і ты расчароўваешся ў гэтым аўтары, бо ён так і застаецца на адным узроўні, не расце ці ўвогуле сыходзіць з літаратуры. Памятаю, як у 90-я гады працаваў у часопісе «Бярозка». І там знаходзіўся архіў часопіса, пачынаючы з 30-х гадоў. Я глядзеў нумары за 50-60-я і сустракаў імёны людзей, што сталі нашымі класікамі, а таксама імёны, якія мне ні пра што не кажуць. І часам было так, што творы, напісаныя невядомымі аўтарамі, аказваліся вельмі цікавыя і арыгінальныя. І, наадварот, творы літаратараў, якіх мы цяпер паважаем, — даволі прасценькія і прымітыўныя. Таму адна з галоўных задач любога рэдактара, калі чытаеш твор маладога пісьменніка, — паспрабаваць прадбачыць, што яго чакае праз 10-20 гадоў.

**Ганна ВАРОНКА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

## Ликвидатор объявляет о продаже имущества ЗАО «МВЗ ИНТЕР» (УНП 191118411):

С.Т.Р.Ш. ГСУ31 (418195), в количестве одной единицы. Начальная цена предмета торгов – 1885,82 бел. руб. без учета НДС 20 %;

СТ. КШ. БУА31 (418120), в количестве одной единицы. Начальная цена предмета торгов – 1457,15 бел. руб. без учета НДС 20 %;

СТ.В.Ф. 6М12П (440846), в количестве одной единицы. Начальная цена предмета торгов – 588,61 бел. руб. без учета НДС 20 %.

Аукцион состоится 31.05.2020 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6 (организатор торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по адресу: Минск, Партизанский, 8.

Шаг аукциона – 5 процентов.

Продавец – ЗАО «МВЗ ИНТЕР».

Организатор торгов – ООО «Фибл», 220073, г. Минск, а/я 156;

Тел. 8 (029) 343-25-10; e-mail: fibl55@mail.ru.

Прием заявок начинается с момента выхода объявления и прекращается за три дня до начала торгов.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с BY07SLAN30123243800450000000 в ЗАО Банк ВТБ, г. Минск, БИК SLANBY22, УНП 191118411, получатель – ЗАО «МВЗ Интер», назначение платежа: задаток за предмет торгов.

При признании торгов несостоявшимися в связи с одним участником возможна продажа по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Договор купли-продажи заключается с победителем аукциона в бел. руб. в течение 5 рабочих дней

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении четвертых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Стройфинпроект» (УНП 690334841, г. Минск, ул. Беломорская, д. 21, пом. 142), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов:* 5 июня 2020 года.** Начало – 10.00. Заявки принимаются с 21 мая 2020 года по 4 июня 2020 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

**Организатор торгов:** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Стройфинпроект» (УНП 690334841)** в лице антикризисного управляющего - ЧУП «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17.

| № лота | Наименование | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Машиноместо с инв. номером 500/D-708047541, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 48А-51, площадь 14,6 кв. м | 9 300,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |
| 2 | Машиноместо с инв. номером 500/D-708047561, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 48А-71, площадь 13,8 кв. м | 6 700,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | | |

***Для участия в торгах необходимо***

1. В срок до 17.00 4 июня 2020 года перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 04.06.2020 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 N 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 168 (29035) за 05.09.2019.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 201 (29068) за 22.10.2019.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 231 (29098) за 05.12.2019.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 29 (29143) за 13.02.2020.

---

В суд Первомайского района г. Витебска поступило заявление о признании **безвестно отсутствующим ГРАКУНА Павла Сергеевича, 23.11.1981 года рождения,** уроженца г. Брагина Гомельской области, последнее известное место жительства: Витебская обл., г. п. Бешенковичи, ул. Молодежная, 9 – 21.

Просьба к гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Гракуне П. С., сообщить их суду Первомайского района г. Витебска в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

---

Центр Промышленной Оценки

**• Организация аукционов**

**• Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37 |

**Предмет аукциона**

**Административное помещение** (общ. пл. 653,9 кв. м, 500/D-681880).
Месторасположение: **г. Минск, ул. Кальварийская, д. 37, корп. 1, пом. 2**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 940 837,18 бел. руб.** (снижена на 40 %)

**Условия аукциона:** покупатель обязан приобрести встроенное оборудование, числящееся на балансе продавца

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.04.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 02.06.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.06.2020 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

---

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ОАО «Гомельгазстрой»** (УНП 400230107), г. Гомель, пр-т Геофизиков, 1, в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Ликвидация и банкротство», тел. +375 (33) 366-87-87.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **22 июня 2020 г. в 10.00 по адресу:** г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Наименование, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | капитальное строение с инв. № 350/С-79989 (склад краски) общ. пл. 513 кв. м | 40 400,00 |
| 2 | капитальное строение с инв. № 350/С-161940 (здание гаража) общ. пл. 1296,6 кв. м, покрытие щебеночное (инв. № 020737) | 141 500,00 |
| 3 | капитальное строение с инв. № 350/С-161942 (здание материального склада) общ. пл. 746 кв. м, забор ограждения блочный (инв. № 020740) | 71 600,00 |
| 4 | капитальное строение с инв. № 350/С-161941 (административно-бытовой корпус) общ. пл. 800,8 кв. м, водопроводная сеть (инв. № 030756), канализационная сеть керамическая (инв. № 030760), канализационная сеть чугунная (инв. № 030758), кабельные линии базы (инв. № 030755), – тепловая сеть (инв. № 030757), покрытие асфальтобетонное (инв. № 020738) | 281 133,00 |
| 5 | капитальное строение с инв. № 350/С-79987 (красный уголок) общ. пл. 179,9 кв. м | 23 300,00 |
| 6 | 7/20 доли в праве на капитальное строение с инв. № 350/С-163649 (административное здание) общ. пл. 372,9 кв. м | 16 200,00 |
| 7 | капитальное строение с инв. № 350/С-163011 (здание неустановленного назначения (туалет)) общ. пл. 14,3 кв. м | 7 600,00 |
| Местонахождение – г. Гомель, ул. Базовая, 6, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03 | | |

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 21.05.2020 с 09.00 по 19.06.2020 до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомсельмаш» (продавец) извещает о проведении <u>23 июня 2020 года открытого аукциона</u> по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-82121 площадью 703, 9 кв. м,** назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-производственное. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003000775 площадью 0,1639 га – для эксплуатации и обслуживания здания административно-производственного (право аренды). **Местонахождение:** г. Гомель, ул. Рабочая, д. 7. **Капитальное строение с инв. № 350/С-159313 площадью 0,0 кв. м,** протяженность – 33,8 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – канализационная сеть. **Адрес:** г. Гомель, ул. Рабочая, 7 участок канализационной сети от КК-1 до КК-3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003002781 (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-160641 площадью 0,0 кв. м,** протяженность – 37,8 м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть. **Адрес:** г. Гомель, тепловая сеть от административного здания до зданий мастерских и складов по ул. Рабочая, 7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003002820 (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-159320 площадью 0,0 кв. м,** протяженность – 63,6 м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи. **Адрес:** г. Гомель, линия электропередачи от ТП-828 до здания по ул. Рабочая, 7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003002787 (присвоен предварительно) | 131 263,00 | 6 563,15 |

**Продавец:** ОАО «Гомсельмаш», г. Гомель, ул. Шоссейная, 41. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 59-23-93 – Медушевская Наталья Александровна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 21 мая 2020 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов) <u>заканчивается 19 июня 2020 г. в 16.00 включительно</u>. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того,** что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.**Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## О реализации имущества частного предприятия «Транспортное бюро»

**Сведения об организаторе торгов:** ООО «Госпромсервис»: 210015, г. Витебск-15, а/я 71, тел. +375 (33) 379 18 88

**Продавец:** частное предприятие «Транспортное бюро» (Витебская обл., Оршанский р-н, Устенский с/с, аг. Устье, д. 24, к. 4, УНП 391700177, тел. +375 (29) 604-08-89).

**Форма, дата, время, место и ранее опубликованные в СМИ извещения о проведения торгов: третьи повторные торги (с минимальной ценой лотов)** с повышением начальной цены в форме аукциона по реализации транспортных средств частного предприятия «Транспортное бюро» будут проводиться **03.06.2020 и длятся 1 (один) день (с 09.00 до 16.00) на электронной торговой площадке по адресу: promtorgi.by.** Опубликованные извещения: 21.02.2020 «ЗВЯЗДА», 18.04.2020 «РЭСПУБЛІКА», 07.05.2020 «ЗВЯЗДА»

**Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов:** всего сформировано 3 лота с понижением начальной (оценочной) стоимости на 50 (пятьдесят) процентов. Начальная цена предмета торгов по каждому лоту указана без учета НДС. **Продавец освобожден от уплаты НДС в соответствии с действующим законодательством.** Имущество принадлежит продавцу на праве хозяйственного ведения

| Наименование | Начальная цена за один лот, руб. | Размер задатка 10 %, руб. | Шаг аукциона 5 %, руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот 1:** грузовой фургон тентовый MAN 8-224, кузов № WMAL34ZZZYG144573, рег. № AI 6670-2, 1999 г. в. | **9 000,00** | **900,00** | **450,00** |
| **Лот 2:** грузовой фургон тентовый MAN 8-224, кузов № WMAL34ZZZYG144550, рег. № AI 6669-2, 1999 г. в. | **7 000,00** | **700,00** | **350,00** |
| **Лот 3:** прицеп-фургон тентовый IN.PROIZV HWTPAS1383, кузов № W09TPS213-X0H49413, рег. № A6268A-2, 1999 г. в. | **1 900,00** | **190,00** | **95,00** |

**Осмотреть имущество, расположенное: лот № 1 и лот № 2** в Витебской обл., г.Орша, ул. Марата, 111а, **лот № 3 –** Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая 129а, можно в любое время по предварительной договоренности с организатором торгов и (или) продавцом (собственником имущества). Контактное лицо для осмотра имущества: Кудряшов Алексей Александрович, тел.: +375 (29) 717-70-10, +375 (29) 662-47-03

**Размер задатка для участия в торгах:** задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов (лота) перечисляется до подачи заявления на расчетный счет организатора торгов – **ООО «Госпромсервис» BY60 PJCB 3012 2032 2210 0000 0933 в ЦБУ № 200 ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, УНП 391856006**

**Сроки и место приема заявлений для участия в торгах и прилагаемых к ним документов:** заявления на участие в аукционе (электронных торгах), платежный документ о перечислении задатка с отметкой банка, копии свидетельства о государственной регистрации, учредительных документов, а также документов (приказа, доверенности), подтверждающих полномочия лица, подписавшего заявление, направляются по адресу: **210015, г. Витебск-15, а/я 71** и (или) по эл. почте: gospromservis@mail.ru, либо вручаются организатору торгов в рабочие дни, начиная **с 08.00 21.05.2020** и заканчивая в срок **не позднее 02.06.2020 до 17.00. Последний день внесения задатков (оплаты) – 02.06.2020 до 17.00.**
**Условия аукциона:** 1. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом. 2. В случае признания торгов несостоявшимися в виду подачи заявления на участие только одним участником, возможна продажа данного объекта заявившемуся участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. 3. Победитель аукциона или единственный участник (претендент на покупку) возмещает продавцу (собственнику предмета торгов) на основании счета-фактуры: расходы по оплате вознаграждения поверенному (организатору торгов) в размере 3 % от конечной цены продажи предмета торгов (лота), фактические затраты по организации и проведению торгов в форме аукциона по каждому лоту в отдельности, в том числе по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся торгам в течение 5 (пяти) календарных дней с даты проведения торгов. 4. Результаты торгов аннулируются в случае отказа или уклонения победителя (претендент на покупку) от: А) подписания протокола по результатам торгов в день их проведения и (или) договора купли-продажи в установленные сроки; Б) возмещения вознаграждения поверенному (организатору торгов), а также всех затрат, связанных с организацией и проведением торгов, указанных выше. 5. Договор купли-продажи заключается в течение 5 (пяти) календарных дней с даты проведения аукциона. Победитель торгов (претендент на покупку) в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения торгов оплачивает цену объекта аукциона за минусом суммы внесенного задатка. 6. Участникам, не признанным победителями либо отказавшимся от участия в торгах, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, в том числе: а) юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям: в безналичной форме либо на карт-счет участника торгов за минусом суммы комиссионного вознаграждения, взымаемого банком; б) физическим лицам: на личный карт-счет участника торгов, а при отсутствии счета – денежным переводом через РУП «Белпочта», за минусом суммы комиссионного вознаграждения (почтового сбора). **Подробная информация размещена на сайте promtorgi.by**

**Узденский районный исполнительный комитет 23 июня 2020 года в 10.00 по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22 проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков и на право частной собственности**

**Организатор аукциона –** Узденский районный исполнительный комитет.
На аукционные торги для заключения договоров аренды выставляются участки

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка, (кроме расх. на публикацию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., Узденский р-н, Слободской с/с, в районе д. Калининск | 0,5400 | 625683200004000010 | 519,75 | 51,98 | 3597,45 | Земельный участок, расположен в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт; в придорожной полосе автомобильной дороги |
| 2 | Минская обл., г. Узда, ул. К. Маркса | 0,3054 | 625650100003001706 | 5703,35 | 570,34 | 2480,25 | Земельный участок расположен в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт; охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения; в охранных зонах объектов газораспределительной системы |

Целевое назначение участка № 1 – для строительства и обслуживания производственно-складского объекта с подъездной дорогой (для размещения объектов обрабатывающей промышленности, код 1 11 02). Имеется возможность подключения к центральному электроснабжению. Срок аренды – 50 лет. Целевое назначение участка № 2 – для строительства и обслуживания станции технического обслуживания автомобилей (для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей, код 1 16 04). Имеется возможность подключения ко всем необходимым инженерным сетям.

**На аукционные торги по продаже земельных участков в частную собственность для ведения коллективного садоводства выставляются участки**

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка, (кроме расх. на публикацию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., Узденский р-н, Деценский с/с, СТ «Турист-Узда», уч. № 124 | 0,0919 | 625680200015000011 | 1350,00 | 135,00 | 1218,12 | - |
| 2 | Минская обл., Узденский р-н, Деценский с/с, СТ «Турист-Узда», уч. № 111 | 0,0781 | 625680200015000007 | 1200,00 | 120,00 | - | - |

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (либо через своего представителя или уполномоченное лицо) предъявляет:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ, с указанием банковских реквизитов юридического лица (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (017 18) 5 47 05).

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона, который перед началом аукциона необходимо обменять на аукционный номер.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 405, по рабочим дням с 22 мая по 17 июня 2020 г включительно с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.

Аукцион состоится по лоту при наличии двух или более участников аукциона.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код банка AKBBBY2X, код платежа – 04002 (плата за право заключения договоров аренды земельных участков), платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».

Заключительная регистрация – с 900 до 950 в день проведения аукциона.

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по телефонам 8 (01718) 6 54 04, 5 47 05

**Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.gov.by** либо по адресу г. Узда, ул. Советская, 22, каб. 405 и **по телефону 8 (017 18) 5 47 05**

*Ёсць ідэя!*

# У падарожжа — па «зялёных маршрутах»

**У БДУ падвялі вынікі маладзёжнага конкурсу стартапаў Startup Heart. Перамог у ім праект TheGreenWay студэнтаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Іх ініцыятыва скіравана на папулярызацыю аграэкатурызму ў Беларусі і прадугледжвае стварэнне мабільнай праграмы для самастойных падарожжаў па «зялёных» маршрутах краіны.**



На платформе будзе сабраная інфармацыя аб аграсядзібах, гістарычных славутасцях, прыродных аб'ектах. Кожны маршрут плануецца суправадзіць падрабязным апісаннем на рускай і англійскай мовах з фотаздымкамі і водгукамі падарожнікаў. Усе аб'екты таксама будуць мець сістэму пазначэнняў даступнасці для дзяцей і людзей з інваліднасцю.

Другога месца ўдастоены праект TeenJob, прысвечаны арганізацыі стажыровак для падлеткаў. Яго аўтарамі выступілі студэнты факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Ініцыятыва заклікана дапамагчы падлеткам ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў знайсці для сябе магчымасці для падпрацоўкі і валанцёрства.

На трэцім месцы аказаліся дзве ініцыятывы — платформа для знаёмстваў GoWithMeNow ад студэнтаў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і праграма-слоўнік дыялектызмаў беларускай мовы MOVA, прапанаваны нашым суайчыннікам Максімам Багдановічам, які зараз навучаецца ў Гарвардскім універсітэце.

Фінал конкурсу прайшоў у анлайн-фармаце. Члены журы ў прамым эфіры задалі пытанні ўдзельнікам і падвялі вынікі, ацаніўшы перспектыўнасць і значнасць іх стартапаў.

Усяго была прадстаўлена 21 ініцыятыва, 13 з іх атрымалі прызы і фінансавую падтрымку ад ВНУ і інвестараў, а іх аўтары — магчымасць прайсці стажыроўкі ў кампаніях-партнёрах.

Арганізатарам конкурсу выступіў эканамічны факультэт БДУ пры падтрымцы EPAM Belarus.

## Даведка

Startup Heart — адукацыйны конкурс стартапаў для моладзі. Першы сезон стартаваў у маі 2019 года і сабраў больш як 40 праектаў. Сёлета конкурс атрымаў статус міжнароднага, бо да яго далучыліся таксама ўдзельнікі з Казахстана і ЗША.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з сайта БДУ.**

**Общее собрание кредиторов ОАО «Трест Белтрансстрой» по вопросу утверждения актуализированного плана санации ОАО «Трест Белтрансстрой» (по состоянию на май 2020),**
а также иных вопросов, входящих в компетенцию общего собрания кредиторов ОАО «Трест Белтрансстрой», состоится 25.05.2020 в 10.00 по месту расположения ОАО «Трест Белтрансстрой» по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8 (кабинет охраны труда). С планом санации ОАО «Трест Белтрансстрой» кредиторы могут ознакомиться на официальном сайте ОАО «Трест Белтрансстрой» www.trestbts.by».
УНП 100120922

**РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении открытого аукциона**

по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «БелЛекоЦентр» (продавец). Лот № 1:** грузовой вагон VOLKSWAGEN CRAFTER, кузов (рама) № WV1ZZZ2EZ86013461, г. в. – 2007, цвет – белый. **Местонахождение:** г. Минск, ул. Мясникова, 76-1Н. **Начальная цена с НДС –** 11 280,00 руб. Аукцион состоится **23.06.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Ликвидатор объявляет о продаже имущества ЗАО «МВЗ Фарбатек»** (УНП191118281):

1. Гальвано-автомат цинкования (556144) в количестве одной единицы. Начальная цена предмета торгов – 61 317,00 бел. руб. без учета НДС 20 %.

**Аукцион состоится 31.05.2020 г. в 10.00 по адресу:** г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6 (организатор торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по адресу: Минск, Партизанский, 8.

Шаг аукциона – 5 процентов.

Продавец – ЗАО «МВЗ ИНТЕР».

Организатор торгов – ООО «Фибл», 220073, г. Минск, а/я 156.

Тел. 8 (029) 343-25-10; e-mail: fibl55@mail.ru.

Прием заявок начинается с момента выхода объявления и прекращается за три дня до начала торгов.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с BY56SLAN30123243500170000000 в ЗАО Банк ВТБ, г. Минск, БИК SLANBY22, УНП 191118281, получатель – ЗАО «МВЗ Фарбатек», назначение платежа: задаток за предмет торгов.

При признании торгов несостоявшимися в связи с одним участником возможна продажа по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Договор купли-продажи заключается с победителем аукциона в бел. руб. в течение 5 рабочих дней.

SEX-БАЛЯСЫ

# РАБОТА МАРЫ

**Пэўна ж, у кожнага з нас уласныя ўяўленні пра яе. («Як растлумачыць начальству, што калі работа любімая, то на ёй хочацца спаць?!») 35-гадовая шматдзетная маці Клэр О'Коннар з англійскага графства Кент тры гады адпрацавала ў гатэлі прыбіральшчыцай. Відавочна, гэты занятак не быў марай усяго яе жыцця. («— Ты дзе? — У пекле! — А, ну выйдзеш з работы, патэлефануй») У нейкі момант Клэр надакучыла атрымліваць капейкі, і яна задумалася аб адкрыцці сваёй клінінгавай кампаніі. («— Ты хто? — Вярстальшчык. — Звярстай мне жыццё наноў!») Праз нейкі час прадпрымальная маці стварыла сайт над назвай Fantasy Clean. На ім было ўказана: жанчына будзе прыбірацца ў вашым доме... галышом. Усяго за 95 фунтаў стэрлінгаў у гадзіну. З аголенымі грудзьмі — за 85 фунтаў, а ў споднім бялізне — за 75 фунтаў стэрлінгаў. («— Як чароўна ад цябе пахне, пах зводзіць мяне з розуму, прабуджае жывёльныя інстынкты. Што гэта за парфума? — Гэта ў мяне чабурэк у дэкальтэ праваліўся».) Што цікава, муж Клэр, ведаючы не шалёны характар, не стаў пратэставаць супраць ідэі жонкі. («Як растлумачыць дзіцяці, што калі маці ў касцюме медсястры, дык тату не дрэнна, а вельмі добра?»)**

Жанчына расказала пра свае планы адносна бізнесу. («Калі імператрыца ліхая, значыць, у яе імператара нармальнага не было».) Дарэчы, не такі ён і новы. Некалькі гадоў таму яшчэ адна брытанка, 25-гадовая жыхарка Эдынбурга, адкрыла аналагічную клінінгавую кампанію з аголенымі прыбіральшчыкамі, наняўшы 15 супрацоўнікаў, у тым ліку трох мужчын. («Цікава, хто-небудзь хоць раз дагледзеў нямецкі фільм з гаспадыняй дома і сантэхнікам? Кран ён у выніку пачыніў?») Па яе словах, пры прыборцы дома будзе прысутнічаць адна аголеная супрацоўніца і адзін кліент. Ніякіх дотыкаў, фотаздымак, увогуле «нічога лішняга». («З моды ніколі не выходзіць толькі касцюм Евы».) Прыбіральшчыца прыходзіць, выконвае сваю работу і сыходзіць, запэўніла Клэр. («Цяжка быць адзінай дзяўчынай на рабоце... Усе гэтыя непрыстойныя погляды, пахабныя жартачкі і двухсэнсоўныя намёкі на секс... Сама вельмі здзіўленая, што мяне дагэтуль не звольнілі».) Адзінае — уся гэтая гісторыя пачыналася яшчэ да пандэміі... Таму трэба меркаваць, што шматдзетнай маці давялося адкласці ўвасабленне ў жыццё планаў пра аголеных прыбіральшчыкаў да лепшых часоў.

А вось стрыптызёркі ў ЗША не сталі іх чакаць. Пасля таго як эпідэміялагічная абстаноўка прывяла да сацыяльнага дыстанцыравання, стрыптыз-клуб у Портландзе мусіў закрыць свае дзверы. Тым не менш яго ўладальнік Шон Боўлен творча падправіў кірунак уласнага бізнесу, адкрыўшы службу дастаўкі ежы Boober Eats: стрыптызёркі прывозяць яе да дзвярэй тым, хто знаходзіцца ў самаізаляцыі. («Мужчына ў гадах прыходзіць у аддзел кадраў фірмы. Кадравік: — На жаль, вы нам не падыходзіце. Нам патрэбны людзі маладыя, амбіцыёзныя, здольныя творча расці! Мужчына: — І ўсё-ткі запішыце мой нумар тэлефона. Калі высветліцца, што ў вас усе творча растуць, а працаваць няма каму, — патэлефануйце».) Уладальнік стрыптыз-клуба расказаў, што ўсё пачыналася як жарт, але калі пасыпаліся заказы, вырашана было заняцца справай усур'ёз. («Дзве адэскія сяброўкі: — Хаечка, шо-та я маральна стамілася. — Сімачка, у чым праблема? Такі адпачні амаральна!») Калі паступае заказ, на выклік прызначаюцца дзве стрыптызёркі з налепкамі на грудзях. Яны прывозяць ежу да дзвярэй, адыходзяць на бяспечную адлегласць, а затым танцуюць. Стрыптызёркі таксама пазіруюць для фатаграфій. Па словах уладальніка клуба, яго каманда «дастаўляе прадукты і крыху настрою». («Як кажуць індыйскія псіхааналітыкі: вы хочаце станцаваць пра гэта?»)



Цяпер многія перайшлі на аддаленую работу — сітуацыя з каранавірусам вымусіла. («Сказалі, што падчас эпідэміі неабходна трымаць дыстанцыю два метры. Шырыня нашага ложка — 1,8 метра. Жонка адмаўляецца спаць на падлозе, што рабіць?») Тут, вядома, нічога добрага няма. Але я крыху пра іншае. («— Раней жа яно як было? — Як? — А цяпер шо? — Шо? — Вось я і гавару!») Слухайце, аказваецца, так можна было?! Як-ніяк, дваццаць першае стагоддзе! Нездарма ж кажуць, што свет ужо не будзе такі, як раней. («Прыбраў з подпісу ў службовай пошце фразу «з павагай». Цяпер любое маё пісьмо калегам і начальству па змаўчанні дзёрзкае».) Аказваецца, можна цудоўна абыходзіцца без нарад, планёрак, сходаў!.. Да нядаўняга часу, калі што не так, цябе адразу на дыван да шэфа... («Як казаў мой ранейшы начальнік — усё лечыцца сексам. Я пры ім не тое што не хварэла — кашлянуць баялася».) Цяпер з гэтым неяк спакайней стала. («— Чаму вы спазніліся на работу? — А чаму вы мне зарплату затрымалі? — Але ж у выніку мы пералічылі вам грошы! — Ну дык і я ўрэшце прыйшоў!») У інтэрнэце нават прайшлі адмысловыя конкурсы-парады наконт таго, як лепш уладкаваць дома рабочае месца. («Першае правіла работы на аддаленцы: калі вы не змаглі нешта дастаць, не ўстаючы з канапы, значыць, тое вам і не патрэбна».) Праўда, як і ў любога медаля, тут ёсць зваротны бок. У выглядзе той жа канапы, халадзільніка... («Прабыўшы некалькі дзён дома, я зразумеў, чаму мой кот пастаянна просіць жэрці».) Так што і з марамі трэба быць асцярожнымі.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**



# «Року ніколі не здраджу»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Склад гурта за дзесяць гадоў паспеў не раз памяняцца. А ваша музыка?***

— Я слухаю розную — і поп, і клубную, але выконваў заўсёды толькі рок. Ён жывы і сапраўдны. Мне падабаецца быць сумленным, а рок — сумленная музыка. Гэтаму стылю я ніколі не здраджу. Магчыма, у нейкіх сітуацыях магу праспяваць у іншым жанры, але таксама не ў любым. Напрыклад, шансон — зусім не маё. Ці тое, што можна назваць празмернай папсой, скажам, «Ласкавы май». Калі шчыра, мы пару разоў эксперыментавалі і выконвалі той жа шансон, але гэта было на першага красавіка ў якасці гумарыстычнага нумару.

***— Вы ўдзельнічалі ў музычных тэлевізійных шоу «Голас» і «Х-фактар»...***

— Гэта для мяне было своеасаблівым урокам і выпрабаваннем. Я рэдка бяру ўдзел у розных конкурсах, з усіх выбіраю найбольш рэйтынгавыя, але не дзеля таго, каб пацешыць уласнае самалюбства, а дзеля прафесійнага росту. Бо, калі ты выходзіш з зоны камфорту, ты вучышся працаваць у цалкам новых умовах, і гэта цябе загартоўвае. На самай справе я не вельмі задаволены вынікамі «Х-фактару», бо пасля яго нічога не змянілася, але задаволены тым, што адбывалася на самім конкурсе. Людзі, эмоцыі — гэта было выдатна! А вось вынікам шоу «Голас» я рады. Ён аказаўся для мяне больш значным.

***— Атрымліваецца, для вас усё ж такі важнейшы ўдзел, а не перамога?***

— У гэтым выпадку так. Перамагчы, вядома, хочацца само сабой, і гэта абсалютна нармальна. Але, калі раптам не атрымліваецца, канец свету не надыдзе. Такую пазіцыю я прыняў яшчэ на «Новай хвалі». Аляксандр Давыдавіч Рэўзін сказаў нам тады: «Хлопцы, сярод вас пераможа не той, хто зойме першае месца, а той, хто атрымае работу хоць бы на бліжэйшыя пяць гадоў». У маім выпадку так і выйшла, я атрымаў не толькі працу, але і найважнейшую творчую ўзнагароду ў маім жыцці — «Залатую зорку Алы» ад Пугачовай.

***— Нягледзячы на тое што ваша музычная кар'ера пачала імкліва развівацца, вы не забыліся пра тэхнічную адукацыю, сталі выкладчыкам...***

— У гэтым няма нічога дзіўнага, работа ва ўніверсітэце таксама важная для мяне. А музыка — усё ж хобі, якое, праўда, аплачваецца і да таго ж прыносіць задавальненне. Вядома, цяпер з-за яе я менш часу аддаю выкладчыцкай дзейнасці і працую на чвэрць стаўкі. Але гэта мне зусім не перашкаджае. Работа выкладчыкам — таксама своеасаблівае акцёрскае майстэрства, бо прачытаць або пераказаць тое, што напісана ў кніжцы — гэта адно, а іншая справа — данесці інфармацыю. Такая ж задача ёсць і ў любога артыста: трэба данесці сваю творчасць так, каб яе зразумелі і прынялі гледачы. Імкнучыся быць цікавым для студэнтаў, я прапампоўваю свой артыстычны ўзровень. Да кожнага занятку шукаю розныя адметнасці, каб яны зразумелі, запомнілі, ну а потым паспяхова адказалі на экзамене.



***— Шмат каму вы сталі знаёмыя па ролі ў серыяле «Мухтар». Раскажыце, як патрапілі ў яго.***

— Гэта не першы мой вопыт, да яго прымаў удзел у тэатральных пастаноўках і мюзікле, а таксама ў пары фільмаў. Я даўно сябрую са Святланай Бруханавай, якая іграе адну з галоўных гераінь — Кацю Каліціну. І па збегу абставін яна «закінула» маё партфоліа рэжысёру, які тады працаваў на гэтым праекце. Я, напэўна, яму спадабаўся і мяне спачатку ўвялі ў эпізадычную ролю. А потым сказалі пра майго персанажа «О, а давайце працягнем гэтую гісторыю». І ў выніку на працягу двух сезонаў у нас са Светай было каханне. Наогул, я даўно марыў сыграць у кіно якуюнебудзь вялікую і сур'ёзную ролю. Няважна, у фільме якога жанру, баявік тое або драма.

***— У вас ёсць любімая песня з уласнага рэпертуару?***

— Кожная кампазіцыя, калі нараджаецца, аўтаматычна становіцца такой. Калі мы ствараем новы трэк, то не робім гэта з мэтай з'яўлення сусветнага хіта, а проста таму, што нам гэта ў кайф. На мой погляд, «Шчасце» — гэта лепшае, што мы напісалі. Яна вельмі нефарматная, вельмі доўгая, але па-вар'яцку прыгожая, сапраўдная і ўтульная.

***— Вы тата дзвюх дачок. Хацелі б, каб яны пайшлі па вашых слядах?***

— Магчыма. Але зноў-такі, у мяне няма ўстаноўкі на тое, што яны абавязкова павінны стаць артысткамі. Я хачу толькі, каб яны былі шчаслівымі людзьмі і займаліся тым, што ім самім падабаецца. А ці будуць гэта песні, танцы, вышыванне або вышэйшая матэматыка, мне ўсё роўна. Калі мае дзеці будуць задаволены ў гэтым плане, я стану самым шчаслівым бацькам.

***— Ці застаецца час на хобі ў такім шчыльным графіку жыцця?***

— Я дастаткова рознабаковы чалавек, і ў мяне мноства захапленняў. Галоўным з іх з'яўляецца матацыкл. Часта ганяю на ім, некаторыя могуць падумаць, што гэта частка іміджу, але гэта для душы. Акрамя таго, вельмі люблю падарожнічаць — як падчас гастроляў, так і са сваёй сям'ёй. Адночы адкрыў для сябе такі від спорту, як сёрфінг і палюбіў яго. Прычым, у маёй дачкі гэта атрымалася асвоіць яго першай з нас.

***— Якімі асноўнымі якасцямі павінен валодаць сапраўдны артыст?***

— У кожнага свае адметныя рысы. Але як па мне, ёсць адна якасць, якая павінна быць у кожнай вядомай асобы — быць добрым чалавекам. Ёсць папулярныя артысты, якія ў жыцці агідныя людзі, ёсць яшчэ больш вядомыя, якія ў чалавечых стасунках больш душэўныя, чым на сцэне. Асабіста мне гэта імпануе, падабаюцца тыя, хто паводзіць сябе сумленна ў адносінах да гледача, не нацягваючы на сябе маскі. Шкада, што шмат хто ў наш час пра гэта забывае.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.05.2020 г.

# «РАБОТА ЦІКАВАЯ, АЛЕ НАДЗВЫЧАЙ НАПРУЖАНАЯ — ПРАЦУЕМ І ЎНАЧЫ, І Ў ВЫХАДНЫЯ»



## Трэцяя група рызыкі

— Дазвол на работу з COVID-19 мы атрымалі 13 красавіка і ўжо на наступны дзень паставілі першыя пробы. З 22 красавіка падключылася наша другая лабараторыя, якая размешчана ў Ратамцы. З таго часу паўнаццэнна працуюць дзве лабараторыі і каля двух дзясяткаў супрацоўнікаў, — расказвае **ўрач-вірусолаг, загадчык лабараторыі вірусных даследаванняў і дыягностыкі ВІЧ/СНІД лабараторнага аддзела Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Наталля ЦЕХАНОВІЧ** *(на фота)*.



Спецыялісты першай лабараторыі (яна знаходзіцца ў Мінску па вуліцы П. Броўкі) і раней праводзілі даследаванні метадам ПЦР, якія і прымяняецца для выяўлення COVID-19, у прыватнасці, ён выкарыстоўваўся для дыягностыкі грыпу і вірусных кішэчных інфекцый. А вось лабараторыя ў Ратамцы спецыялізавалася на асабліва небяспечных інфекцыях і не мела адпаведнага абсталявання. У эпідэміялагічнай сітуацыі, якая склалася, у кароткія тэрміны яно было перададзена туды Нацыянальнай акадэміяй навук, падтрымку аказаў і Мінскі аблвыканкам.

Спецыялісты гэтай лабараторыі мелі допуск да работы з трэцяй групай рызыкі (паводле гэтай класіфікацыі каранавірусная інфекцыя стаіць побач з такімі небяспечнымі хваробамі, як ВІЧ і гепатыт, а самай высокай лічыцца чацвёртая група), прайшлі адпаведнае навучанне і пачалі працаваць.

Колькасць проб, якія цяпер паступаюць у лабараторыі, надзвычай вялікая. Відавочна, што выканаць усе ў адзін дзень нерэальна. Але спецыялісты імкнуцца рабіць максімальна магчымую колькасць тэстаў, працуючы ў кругласутачным рэжыме.

— Мы працуем і ў выхадныя, і ўначы. Калі першапачаткова з пробамі на COVID-19 мелі справу спецыялісты вірусалагічнай лабараторыі, то пасля давялося прыцягнуць супрацоўнікаў і мікрабіялагічнай лабараторыі, — кажа Наталля Цехановіч.

Дапамогу аказваюць і ўрачы, часова пераведзеныя з іншых арганізацый. У прыватнасці, урач-бактэрыёлаг з Чэрвеньскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі і ўрач лабараторнай дыягностыкі з Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансера.

Пробы ў лабараторыі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя вязуць з усіх раёнаў Мінскай вобласці. Іх прыёмка таксама вядзецца кругласутачна.

Каб выконваць максімальную колькасць проб на COVID-19, частку іншых аналізаў давялося перадаць калегам.

— Каб не пацярпелі пацыенты, доўга чакаючы вынікі, пробы на вірусныя гепатыты мы перадалі скрынінгавым міжраённым лабараторыям Мінскай вобласці, лабараторыя мікрабіялогіі перадала частку сваіх даследаванняў Мінскаму занальнаму цэнтру. Самі максімальна засяродзіліся на каранавіруснай інфекцыі, — удакладняе вірусолаг.

## Апрацоўка аднаго тэста займае да сямі гадзін

Калі для медыкаў перапрафіляваных бальніц падзел стацыянара на «брудную» і «чыстую» зоны стаў адным з новаўвядзенняў, то для супрацоўнікаў лабараторыі гэта звычайная з'ява. У «чыстай» зоне яны пакідаюць верхняе адзенне і асабістыя рэчы, тут знаходзяцца пакоі для работы з дакументамі і прыёму ежы. А вось усе памяшканні, дзе вядуцца даследаванні, размешчаны ў «бруднай» зоне. Для работы ў ёй спецыялісты пераапранаюцца ў ахоўнае адзенне — супрацьчумныя касцюмы, рэспіратары, бахілы, пальчаткі, акуляры, шчыткі.

Матэрыял у лабараторыю таксама дастаўляюць з боку «бруднай» зоны — да асобнага ўвахода. Супрацоўнік лабараторыі ў ахоўным адзенні забірае бікс з пробамі, разбірае яго змесціва ў асобным памяшканні і вяртае бікс.

Пасля таго як проба прынята і зарэгістравана, непасрэдна не даследаванне займае 6–7 гадзін. Гэта даволі карпатлівая работа. Мае значэнне і вопыт супрацоўніка. У пераважнай большасці этапы работы ўжо адпрацаваны да аўтаматызму.

— Мы працуем з тэст-сістэмамі трох айчынных прадпрыемстваў. У залежнасці ад вытворцы крыху розняцца этапы даследавання, — тлумачыць Наталля Цехановіч.

Адначасова даследуецца не адзін тэст, а цэлая серыя. Іх колькасць залежыць ад прапускной здольнасці абсталявання — на колькі размяшчаны цэнтрыфугі, тэрмастаты.

## У супрацьчумных касцюмах — палову сутак

Столькі часу цяпер доўжыцца змена супрацоўнікаў.

— Пастаянна працаваць у ахоўных касцюмах асабіста мне раней не даводзілася, — прызнаецца вірусолаг. — Спачатку прыйшлося прывыкаць — касцюмы вельмі шчыльныя, у іх горача. На твары надоўга застаюцца ўмяціны ад рэспіратараў. Але ўжо ніхто з нас не звяртае на гэта ўвагі, ды і падчас работы няма калі засяроджвацца на дыскамфорце. Для выхаду ў «чыстую зону» даводзіцца пераапранацца, таму лішні раз стараемся не выходзіць.

Наталля Цехановіч кажа, што даследаваць новы, дагэтуль невядомы і нявывучаны вірус нават цікава, хоць гэта вельмі напружаная праца. І гэта стане новым досведам для супрацоўнікаў лабараторыі.

— Падчас пандэміі свінога грыпу наша вірусалагічная група таксама праводзіла даследаванні. Тады іх рабілі даволі шмат: пару месяцаў мы працавалі без выхадных. Праўда, не было начных змен, бо людзей тут працавала менш — арганізаваць гэта было немагчыма. Зараз ідзе нашмат большы аб'ём проб, бо аследуюцца не толькі хворыя, але і кантактныя асобы. Мы атрымліваем унікальны вопыт, праўда, хацелася б, каб у будучыні ён не спатрэбіўся.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Мовай лічбаў

У Беларусі на 20 мая выяўлена 32 426 выпадкаў каранавіруснай інфекцыі. Прырост за суткі склаў 918 інфіцыраваных. Папраравіліся і выпісаны са стацыянара ці зняты з амбулаторнага назірання 11 415 пацыентаў (795 за суткі), у якіх раней быў пацверджаны дыягназ COVID-19. За ўвесь час распаўсюджвання інфекцыі памерла 179 пацыентаў (чатыры за апошнія суткі). Усяго ў краіне з канца лютага праведзена 387 673 тэсты (12 579 за суткі).

Будзь у курсе!

## ЛЕКІ З КУР'ЕРАМ

**Аптэчныя сеткі ADEL і «Добрыя лекі» першымі абвясцілі аб запуску сэрвісу па дастаўцы лекаў у буйных гарадах Беларусі. Кур'еры будуць развозіць заказы коштам ад 30 рублёў у рэжыме «сёння на заўтра», прычым атрымаць на дом можна любыя безрэцэптурныя лекі і тавары.**

Дастаўка лекаў увайшла ў прэзідэнцкі пакет мер па падтрымцы эканомікі і сацыяльнай сферы. Праўда, гандляваць прэпаратамі па-за межамі аптэк дазволена да 1 ліпеня. Такое права атрымалі 29 арганізацый, якія ўключаны ў спіс ўрада.

Служба дастаўкі будзе адзінай для сетак ADEL і «Добрыя лекі», а сайт стане агрэгатарам усяго асартыменту абодвух брэндаў. Праз інтэрнэт можна замовіць любыя лекі, якія не патрабуюць рэцэпта ўрача. У заказ таксама могуць уваходзіць і іншыя тавары, у тым ліку сродкі гігіены, медыцынскія вырабы, дыетычнае харчаванне і касметыка.

Дастаўка не распаўсюджваецца на псіхатропныя, наркатычныя і моцнадзейныя рэчывы. Акрамя таго, пакуль не будуць развозіць біялагічна актыўныя дабаўкі і лекі, якія патрабуюць захавання пэўнага тэмпературнага рэжыму пры транспарціроўцы.

«Дастаўка лекаў асабліва актуальная цяпер, калі трэба максімальна абмежаваць кантакты. Перш за ўсё, гэта важна для людзей сталага ўзросту. Цяпер кожны з нас можа замовіць тавары з аптэкі для сваіх бацькоў. Але незалежна ад абставін паслуга па дастаўцы лекаў — гэта таксама патрабаванне часу. Наш спосаб жыцця непарыўна звязаны з дыстанцыйнымі сэрвісамі: заказам прадуктаў, набыццём білетаў, браніраваннем гасцініц, анлайн-заказам таксі і многімі іншымі. Таму гэты праект дазволіць атрымаць новы досвед работы ў рытме жыцця пакупнікоў. Але мы разумеем, што класічны фармацэўтычны сэрвіс з прафесійнай кансультацыяй правізара незаменны і застанецца адным з тых кірункаў, якія наўрад ці магчыма цалкам перавесці ў анлайн», — растлумачылі ў холдынгу «Аптэка Груп».

Першы час лекі будуць развозіць у Мінску, Віцебску, Гомелі і Гродне. Далей геаграфію дастаўкі пашыраць. Мінімальная сума заказу — 30 рублёў плюс тры рублі — кампенсацыя работы кур'ерскай службы. Пакупкі перадаюць у пакетах з фірменным лагатыпам.

Па першым часе кур'ерская служба будзе працаваць з панядзелка да суботы. Калі сэрвіс выйдзе на поўную магутнасць, стануць развозіць і ў выхадныя.

Пры афармленні заказа сістэма прапануе выбраць дастаўку да кватэры ці самавываз з найбліжэйшай аптэкі. У першым выпадку аплаціць пакупку пакуль можна толькі наяўнымі, але неўзабаве падключаць мабільныя тэрміналы для разлікаў па карце і сэрвісы для прыёму электронных плацяжоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АЛА АДКРЫВАЕ СВАЕ ТАЯМНІЦЫ

**Цікавы ваенны трафей знайшлі будаўнікі падчас добраўпарадкавання тэрыторыі каля мемарыяльнага комплексу на месцы спаленай вёскі Ала ў Светлагорскім раёне. Міна, начыненая пасланнямі з папярэджаннем аб адказнасці за зверствы, праляжала ў зямлі больш за 75 гадоў.**

Незвычайны снарад знайшлі ў лесе, дзе ў Вялікую Айчынную вайну праходзіла лінія фронту. Усярэдзіне знаходкі не было баявога зараду.

— У герметычным корпусе выдатна захаваўся цэлы пачак улётак на нямецкай мове. Гэта зварот Чырвонай Арміі да нямецкіх салдат і афіцэраў, — расказала **прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкама Вольга РАБІКАВА.**

Тэкст надрукаваны на паперы сіняга колеру. Як мяркуецца, гэта рабілася для таго, каб улёткі лепш былі бачныя на снезе, калі міна падала і паперкі разляталіся. У пасланні гаворыцца:



«Камандаванне Чырвонай Арміі ўжо папярэджвала і папярэджвае вас, салдаты і афіцэры, паўторна, што вінаватае не толькі нямецкае камандаванне, якое аддае загады аб знішчэнні савецкага насельніцтва, але і нямецкія салдаты і афіцэры, якія выконваюць гэтыя загады. Ніхто з вас не пазбегне расплаты за выкананне гэтых загадаў. Ёсць толькі адзін шлях пазбегнуць адказнасці за злачынствы — не здзяйсняць яго».

У другой частцы ўлёткі змешчаны зварот камандавання Чырвонай Арміі непасрэдна да ваенных 45-й і 707-й дывізій:

«Нам стала вядома, што так званы атрад спецыяльнага прызначэння і паляўнічыя атрады, складзеныя з вашых дывізій, здзяйсняюць злачынствы супраць савецкага мірнага насельніцтва. Так, у лістападзе 1943 года салдатамі і афіцэрамі гэтых атрадаў быў спалены населены пункт Сяльное. 14 студзеня 1944 года жыхары населенага пункта Ала былі сагнаны гэтымі атрадамі ў дамы і адрыны, а затым падпаленыя... Ваш урад сказаў вам, што гэтыя людзі — партызаны, і вы аўтаматычна прывялі ў выкананне загад па забойстве і спальванні. З-за гэтага нявінныя старыя і дзеці прынялі пакутніцкую смерць. Як вы будзеце адказваць за такія жорсткія дзеянні? Хто дарэ вам такія зверствы?»

Каштоўная знаходка перададзена спецыялістам. Далейшы яе лёс вырашыцца ў найбліжэйшы час.

Нагадаем, што на месцы былой вёскі Ала ў Светлагорскім раёне ўзведзены ўнікальны мемарыял памяці аб населеных пунктах Гомельшчыны, якія былі спалены разам з мірнымі жыхарамі. Вядома, што жудасны лёс светлагорскай Алы — гэта ахвяры супараўнальныя 12 Хатыням. У гэтым населеным пункце зімой 1944 года атрад карнікаў спаліў жывымі і расстраляў 1758 чалавек, у тым ліку 950 дзяцей.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## Результаты проведения рекламной игры «Смарт Бонус 2.0»

**Наименование рекламной игры:** «Смарт Бонус 2.0».

**Территория проведения:** Республика Беларусь.

**Период проведения:** с 23 января 2020 года по 30 августа 2020 года.

**В рекламной игре приняли участие 97 935 человек.**

Призовой фонд игры разыгран полностью.

**Поздравляем победителей рекламной игры!**

Полный список победителей представлен на сайте https://www.alfabank.by/articles/pobediteli-v-ramkakh-programmy-smart-bonus-2-0/

**Организатором рекламной игры является** общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», УНП 191728827, Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3728 от 15.01.2020 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 17 363 12 78.**

## ОАО «Дорстройиндустрия» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества

| Лот № 1 | Минская обл., Воложинский р-н, Богдановский с/с, п. Богданов | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| | | 47 934,24 | 4 800,0 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

1. мастерские (инвентарный номер 632/С-16995, к-во этажей – 1, общая площадь – 160,5 кв. м);
2. склад (инвентарный номер 632/С-16999, к-во этажей – 1, общая площадь – 45,2 кв. м);
3. автодорожный подъезд (инвентарный номер 632/С-17820, площадь – 0,1180 га);
4. линия электропередачи (инвентарный номер 632/С-23622, составные части и принадлежности: линия электропередачи ВЛ-10 кВ (в том числе: мачтовая трансформаторная подстанция МТП 25/10/-0,4-2000-У1 (инв. № 1130); линия электропередачи КЛ-0,38 кВ;
5. вагон-домик (инвентарный номер 561);
6. весы железнодорожные вагонные (инвентарный номер 1090)

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 1,9921 га с кадастровым номером 622080801601000075. Назначение земельного участка – земельный участок для обслуживания строений и сооружений гравийно-сортировочного завода «Боруны». Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах линий электропередачи, площадь – 0,3458 га.

Земельный участок площадью 0,0129 га с кадастровым номером 622080801601000076. Назначение земельного участка – земельный участок для обслуживания строений и сооружений гравийно-сортировочного завода «Боруны». Ограничения (обременения) прав в использовании земель – нет.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота № 1 в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 22.06.2020 в 10.00 по адресу: Минская область, Дзержинский район, город Фаниполь, ул. Заводская, д. 1-1, 3-й этаж, актовый зал**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона(Продавцом); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр.лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с BY32BAPB30123268800100000000 в ЦБУ № 510 Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия», УНП 100211220, ОКПО 03455184.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лот № 1), проводимом 22 июня 2020 года.

